ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

НЯДЗЕЛЯ, 22 МАЯ 1938 г. № 28 (370)

Цана 20 кап.

ЛІТАРАТУРА і МАСТАЦТВА

Орган праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР і Упраўлення па справах мастацтваў пры СНК БССР

АДДАНА СЛУЖЫЦЬ НАРОДУ і РАДЗІМЕ

Прайшоўшы пленум праўлення Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР знамянальны тым, што асновай яго работы з'явілася абмеркаванне злободзённых творчых пытанняў і канкрэтнае акрэсленне асноўных задач далейшай работы пісьменнікаў БССР. Задачы, якія стаяць зараз перад літаратурай БССР, былі акрэслены ў прамове в. а. сакратара ЦК КП(б)Б тав. Лявіцкага, у дакладзе в. а. старшыні ЦВК БССР тав. Наталевіча, у спрэчках па творчых пытаннях і запісаны ў прынятых пастановах.

Наша літаратура ў вялікім даўгу ў народа ордэнаноснай Совецкай Беларусі. Яна дагэтуль не выканала прад'яўленых да яе патрабаванняў партыі Леніна—Сталіна і ўсёй нашай соцыялістычнай радзімы. Пісьменнікі не стварылі яшчэ такіх твораў, якія адлюстравалі-б гераічную барацьбу партыі Леніна—Сталіна за пабудову соцыялізма, веліч соцыялістычнай эпохі, цудоўнае красаванне, соцыялістычны ўздым і росквіт Совецкай Беларусі — роўнай сярод роўных адзінаццаці рэспублік вялікага Совецкага Саюза.

Партыяй Леніна—Сталіна, совецкай разведкай на чале са сталінскім наркомам Н. І. Ежовым, пры дапамозе ўсяго совецкага народа, выкрыты і разгромлены варожыя гнёзды прэзрэнных наймітаў крывавага фашызма, трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, шпіёнаў і забойцаў. Ачышчаны ад фашысцкіх паганцаў і рады пісьменнікаў. Ад усякага варожага ахвосця канчаткова ачышчаецца літаратурны фронт.

І самым першым, самым важным, адказным і пачэсным абавязкам кожнага совецкага пісьменніка з'яўляецца напісанне праўдзівых, яркіх, таленавітых твораў пра нашу цудоўную соцыялістычную рэчаіснасць. Совецкая краіна чакае ад пісьменнікаў твораў, якія-б выхоўвалі у большэвіцкім духу дзетвару і моладзь, якія-б натхнялі на далейшую барацьбу за комунізм, служылі справе ўмацнення пільнасці і мабілізацыйнай гатоўнасці совецкага народа да абароны радзімы, бо нельга ні на хвіліну забываць аб капіталістычным акружэнні.

Гэтай рабоце трэба аддаць усе сілы, усё майстэрства, увесь творчы запал, усю страсць мастака. Трэба працаваць так, як працавалі на карысць народа, на карысць справы Леніна—Сталіна найвялікшыя майстры мастацкага слова нашай совецкай эпохі—Аляксей Максімавіч Горкі і Уладзімір Уладзіміравіч Маякоўскі, як працуе, узбагачаючы нашу літаратуру цудоўнымі паэмамі і песнямі, вялікі паэт казахскага народа акын Джамбул, 75-годдзе творчай працы якога адзначае зараз Совецкі Саюз.

На гэту—пярвейшую і важнейшую задачу звярнуў увагу пісьменнікаў БССР прайшоўшы пленум. Большэвіцкае вырашэнне гэтай задачы патрабуе поўнай і канчатковай ліквідацыі вынікаў шкодніцтва на фронце літаратуры, патрабуе карэннага паляпшэння ўсёй работы Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР.

Нажаль, на прайшоўшым пленуме не была належна разгорнута прынцыповая большэвіцкая самакрытыка і крытыка ўсіх памылак і недахопаў у рабоце праўлення і ўсяго Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР. Замоўчванне фактаў і прозвішчаў, падмена агульнымі разважаннямі канкрэтнай вострай крытыкі работы праўлення, творчасці пісьменнікаў, што мела месца на пленуме, ніяк не можа спрыяць далейшаму ўздыму і росту літаратуры БССР.

Развіццю нашай літаратуры перашкаджае некаторая разгубленасць і творчая пасіўнасць паасобных, у прыватнасці старэйшых, пісьменнікаў БССР. Народ совецкай краіны з давер'ем і любоўю адносіцца да майстроў мастацкага слова і патрабуе ад іх плённай творчай працы. Спадзяванні совецкага народа павінны быць цалкам апраўданы працай. І нашы народныя паэты—Янка Купала і Якуб Колас, і ўсе пісьменнікі, атуленыя клопатамі і ўвагай партыі Леніна—Сталіна, нашай радзімы, павінны ўзняцца на новую ступень творчасці, даць новыя, захапляючыя чытача, патрэбныя чытачу творы—творы, вартыя вялікай Сталінскай эпохі.

Авалоданне большэвізмам, ідэйна-палітычнае выхаванне пісьменнікаў у духу ленінізма, непарыўная штодзённая сувязь пісьменнікаў з совецкім народам, з працоўнымі гарадоў і калгасных вёсак Совецкай Краіны, удасканаленне творчага майстэрства — умовы выканання задач, што стаяць перад пісьменнікамі БССР.

Саюз совецкіх пісьменнікаў павінен клапатліва расціць і выхоўваць маладыя літаратурныя кадры, таленавітую моладзь, што ідзе ў літаратуру з рабочага і калгаснага асяроддзя. Дагэтуль справа выхавання маладых кадраў танула ў патоках агульных прамоў і разважанняў на гэту тэму. Марудны рост саюза, наяўнасць ў пісьменніцкай арганізацыі ўсяго 56 членаў і кандыдатаў яскрава пацвярджае гэта. Час пасур'ёзнаму падыйсці да вырошчвання маладых кадраў літаратуры. Багаты талентамі наш народ. І трэба прыкмячаць іх, дапамагаць пачынаючым пісьменнікам з такой увагай і любоўю, як гэта рабіў і вучыў рабіць Аляксей Максімавіч Горкі.

Прадукцыя пісьменнікаў — мастацкія творы, дапамога ўдасканаленню майстэрства і ўзбагачэнню пісьменніка культурай, ведамі,—гэта павінна стаць у цэнтры ўвагі праўлення саюза.

За гэта-ж—за высокую якасць твораў пісьменнікаў, за хутчэйшае данясенне гэтых твораў да чытача, за агульную нашу задачу ўмацнення і развіцця літаратуры павінна змагацца і Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі. Між тым, дагэтуль няма дружнай работы выдавецтва з пісьменнікамі.

Зацяжка з выданнем кніжак мастацкай літаратуры, адсутнасць кваліфікаванай дапамогі пісьменніку, часам няўважлівыя і зусім нетактычныя адносіны да пісьменнікаў з боку асобных рэдактароў выдавецтва (тав. Дашкевіч)—парокі, якія дагэтуль бытуюць у рабоце Дзяржаўнага выдавецтва БССР.

Пленум прайшоў у дні, калі народ Совецкай Беларусі рыхтуецца да вялікага свята—урачыстага дня выбараў у Вярхоўны Совет БССР. І пленум зусім правільна палічыў, што абавязак і гонар кожнага пісьменніка—аддаць усе свае сродкі і майстэрства, усе сілы справе агітацыі мастацкім словам за непарушны сталінскі блок комуністаў і беспартыйных, за вялікую справу Леніна—Сталіна, за кандыдатаў у дэпутаты—лепшых сыноў совецкага народа.

Паэты! Совецкая Беларусь чакае ад вас натхняючых песень—песень пра сонечныя дні соцыялізма, пра наш гераічны народ, пра магутнасць радзімы, пра вялікага правадыра і друга народаў, творца нашага шчасця таварыша Сталіна.

Хвалюючыя, яркія песні павінны стварыць паэты ў творчым яднанні з кампазітарамі. Напісанне калектыўнага твора «Радзіме і правадыру» сведчыць аб здольнасці паэтаў выканаць з гонарам свае пачэсныя абавязкі перад выбаршчыкамі — нашым шчаслівым народам.

Празаікі і драматургі! Агітуйце сваімі творамі за кандыдатаў у дэпутаты нашага соцыялістычнага парламента. Адлюструйце ў сваіх творах магутнасць і адзінства нашага народа—сілу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Добрага рэпертуару патрабуюць клубы заводаў і калгасаў рэспублікі.

Праўленне Саюза совецкіх пісьменнікаў БССР абавязана зараз прыступіць да падрыхтоўкі стварэння кнігі пра слаўны гістарычны дзень 26 чэрвеня 1938 года—дзень выбараў у Вярхоўны Совет БССР.

Кніга павінна з'явіцца выдатным калектыўным творам нашых пісьменнікаў, работнікаў друку, маладых і пачынаючых аўтараў,—творам пра жыццё соцыялістычнай Совецкай Беларусі, пра перамогу сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

У даўгу нашы пісьменнікі і перад мастацтвам БССР. Нашы тэатры не атрымалі арыгінальных п'ес пра шчаслівыя соцыялістычныя дні. А гэтыя п'есы павінны сёння-ж быць на нашай сцэне. Наша мастацтва змагаецца за тое, каб атрымаць права паказаць свой росквіт у сталіцы Совецкага Саюза—працоўным Масквы, вялікаму Сталіну, кіраўнікам партыі і ўрада. За атрыманне гэтага ганаровага права павінны змагацца сёння драматургі, узбагачаючы рэпертуар нашых тэатраў творамі пра сёнешні дзень пагранічнай ордэнаноснай Совецкай Беларусі.

Дапамагчы пісьменнікам у вырашэнні вялікіх і пачэсных патрабаванняў сёнешняга дня павінна наша крытыка.

Партыя Леніна—Сталіна з выключнай увагай, з выключнымі клопатамі адносіцца да совецкага пісьменніка. Створаны ўсе ўмовы для пленнай творчай працы. Зараз усё залежыць ад саміх пісьменнікаў.

З надзвычайнай радасцю чытаюць совецкія пісьменнікі натхняючую прамову таварыша Сталіна на прыёме ў Крэмлі работнікаў вышэйшай школы. Гэта прамова з надзвычайнай сілай і яркасцю акрэслівае задачы работнікаў усяго культурнага фронта, у тым ліку і работнікаў літаратуры.

Таварыш Сталін заклікае змагацца:

«За працвітанне навукі, той навукі, якая не адгароджваецца ад народа, не трымае сябе ўдалі ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваяванні навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добраахвотна, з ахвотай».

Такой павінна быць і совецкая літаратура. Зрабіць яе такой—свяшчэнны абавязак совецкіх літаратараў.

Таварыш Сталін гаварыў у сваёй прамове аб найвялікшым вучоным нашай эпохі, найвялікшым рэволюцыянеру—Леніне. І вобразы вялікага Леніна, вялікага Сталіна—тварцоў перамог, геніяў, якія праклалі дарогу новай, перадавой рэволюцыйнай навуцы, — вучаць совецкіх пісьменнікаў праяўляць ініцыятыву і няспынна дасягаць новых перамог у творчасці.

Прамова таварыша Сталіна заклікае совецкіх пісьменнікаў сваімі новымі творамі так узбагачаць нашу соцыялістычную літаратуру, як узбагацілі тэхніку, адкрыўшы для яе новыя шляхі, Стаханаў і стаханаўцы, як узбагацілі навуку Папанін і папанінцы.

Прыём у Крэмлі ўдзельнікаў Першай усесаюзнай нарады работнікаў вышэйшай школы

На прыёме прысутнічалі таварышы І. В. Сталін, В. М. Молатаў, Л. М. Кагановіч, К. Е. Варашылаў, М. І. Калінін, А. І. Мікаян, В. Я. Чубар, А. А. Жданаў, Н. І. Ежоў.

Чатыры дні прадаўжалася ў Маскве Першая ўсесаюзная нарада работнікаў вышэйшай школы, у якой прымалі ўдзел віднейшыя прадстаўнікі совецкай навукі.

Вечарам 17 мая, у Вялікім Крэмлёўскім палацы адбыўся прыём удзельнікаў нарады, наладжаны Цэнтральным Камітэтам ВКП(б) і ўрадам СССР.

Бурнай авацыяй сустрэлі сабраўшыеся таварышаў І. В. Сталіна, В. М. Молатава, Л. М. Кагановіча, К. Е. Варашылава, М. І. Калініна, А. І. Мікаяна, В. Я. Чубара, А. А. Жданава, Н. І. Ежова.

З прамовамі выступілі старшыня Камітта па справах вышэйшай школы т. Кафтанаў, студэнтка Маскоўскага бібліятэчнага інстытута т. Макарава, дырэктар Маскоўскага нафтавага інстытута акадэмік І. М. Губкін, прафесар Томскага індустрыяльнага інстытута т. Усаў, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР праф. Образцоў, дырэктар Азербайджанскага індустрыяльнага інстытута т. Агабабаў, дырэктар Харкаўскага планавага інстытута т. Бурцаў, дацэнт Маскоўскага скуранога інстытута т. Заёнчкоўскі, дырэктар Тбіліскага медыцынскага інстытута, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР праф. Мачаварыяні, сакратар парткома Маскоўскага энергетычнага інстытута т. Турчанінаў, студэнт механіка-машынабудаўнічага інстытута імя Баўмана т. Гейлікман.

З кароткай прывітальнай прамовай выступіў таварыш Сталін, сустрэты бурнай авацыяй і захапляючымі воклічамі прывітанняў. Апошнім выступіў студэнт Прамысловай акадэміі імя Сталіна, дэпутат Вярхоўнага Совета СССР тав. А. Г. Стаханаў.

Для ўдзельнікаў прыёму быў дан вялікі канцэрт.

КАНДЫДАТЫ БЕЛАРУСКАГА НАРОДА

19 мая адбыліся шматтысячныя перадвыбарчыя сходы працоўных Прамысловай, Молатаўскай і Дзяржынскай выбарчых акруг гор. Менска. Працоўныя сталіцы БССР з вялікай радасцю і шчасцем аднадушна вылучылі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР любімага правадыра, лепшага друга беларускага народа вялікага СТАЛІНА і яго слаўных баявых саратнікаў В. М. МОЛАТАВА І К. Е. ВАРАШЫЛАВА.

Аб'яднаныя перадвыбарчыя сходы прынялі адпаведныя пастановы і паслалі таварышам Сталіну, Молатаву і Варашылаву пісьмы з просьбай даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Ніжэй друкуем пастановы аб'яднаных перадвыбарчых сходаў і пісьмы таварышам Сталіну, Молатаву і Варашылаву.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Іосіфу Вісарыёнавічу СТАЛІНУ

ДАРАГІ І ЛЮБІМЫ ІОСІФ ВІСАРЫЁНАВІЧ!

У дні, калі працоўныя Совецкай Беларусі актыўна рыхтуюцца да выбараў свайго першага соцыялістычнага парламента і намячаюць туды лепшых з лепшых, адданых сыноў нашай шчаслівай радзімы, партыйных і непартыйных большэвікоў, — у гэтыя дні ўсе нашы мыслі і пачуцці накіраваны да Вас, наш правадыр, настаўнік і друг.

Мы, выбаршчыкі менскай Прамысловай акругі, рабочыя і работніцы фабрык і заводаў, інжынеры і тэхнікі, прадстаўнікі працоўнай інтэлігенцыі, добра памятаем праклятае мінулае нашай краіны, цяжкое і беспрасветнае жыццё працоўных горада Менска, былога захалуснага губернскага горада, цэнтра «рысы яўрэйскай аседласці».

Гэта быў горад купцоў, чыноўнікаў, дробных рамеснікаў і горад велізарнейшых мас беднаты. На самым «буйным» прадпрыемстве працавала ў мінулы час не больш 200 чалавек рабочых і служачых. Бяспрыкладная эксплаатацыя працоўных, соцыяльны і нацыянальны ўціск, паліцэйскае сваволле, самадурства царскіх сатрапаў, затхлая і ядавітая павуціна клерыкалізма, — у такіх умовах праходзіла жыццё рабочых і ўсіх працоўных былога Менска.

Не ў інтарэсах мірскіх захрабетнікаў, не ў інтарэсах крывасосаў горада, яго былых «бацькоў», не ў іх інтарэсах было клапаціцца аб дабрабыце горада, аб паляпшэнні матэрыяльна-бытавога становішча яго працоўных. Вузкія, брудныя і крывыя вуліцы, поўразваленыя хібаркі, дапатопны водаправод і конка, ні аднаго прыстойнага тэатра,—такое аблічча старога Менска.

Усё гэта канула ў небыццё. Старога Менска няма. Ёсць новы Менск, сталіца нашай ордэнаноснай рэспублікі, прамысловы, культурны і ўпарадкаваны горад. Новыя фабрыкі і заводы, прыгожыя клубы і бібліятэкі, трамвай, велічныя будынкі Дома Урада, Дома Чырвонай Арміі, Палаца піонераў, тэатра Оперы і Балета, Універсітэцкі гарадок, Дом друку, Клінічны гарадок і многае іншае — рашуча змянілі аблічча нашага горада, зрабілі яго квітнеючым, непазнавальным. Усё гэта з'явілася параўнаўча за кароткі перыяд, за годы совецкай улады. Усё гэта з'явілася ў выніку ўпартай барацьбы працоўных за соцыялізм, у рэзультаце велізарнай дапамогі нашай рэспубліцы ад народаў усяго Совецкага Саюза і ў першую чаргу ад вялікага рускага народа, у рэзультаце правядзення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі, у рэзультаце велізарнейшай увагі, якую аказвалі і аказваеце Вы, Іосіф Вісарыёнавіч, народам Совецкай Беларусі.

Усё, да апошняй пясчынкі зямлі
На ўзоранай трактарным плугам раллі,
Ад краю — у край, ад заходу — да ўсходу
Належыць майму маладому народу.
І скрозь над усім неабсяжным прасцягам
Жыццё пурпуровым абвеена сцягам,
Дзе золатам радасці вышыты герб:
У сонечных променях молат і серп.
І скрозь наша доля пад сцягам чырвоным
Асвечана сталінскім мудрым законам,
Дзе кожная літара — шчасцем для нас,
Гарыць, як крышталына-агністы алмаз.

І гэты закон — вялікая Сталінская Канстытуцыя, геніяльным тварцом якой з'яўляецеся Вы, Іосіф Вісарыёнавіч.

Мы жывем на заходняй граніцы Совецкага Саюза, у непасрэднай блізасці да фашысцкіх дзяржаў, у капіталістычным акружэнні. У нашай памяці—крывавыя жахі кайзераўскай акупацыі, дым пажарышчаў, цені шыбеніц, нагайкі і штыхі белапольскіх бандытаў, якія імкнуліся закабаліць свабодны беларускі народ, адабраць у яго найвялікшыя заваяванні Кастрычніка. Пад Вашым асабістым, Іосіф Вісарыёнавіч, кіраўніцтвам беларускі народ і непераможная Чырвоная Армія разграмілі ворагаў, прагналі іх з нашай зямлі.

Ворагі не пакідалі нас у спакоі. Яны падсылалі да нас сваю подлую агентуру, трацкісцка-бухарынскіх псоў, нацыянал-фашысцкіх бандытаў, шпіёнаў, дыверсантаў, якія прабавалі падарваць магутнасць совецкай дзяржавы, знішчыць велізарнейшыя заваяванні соцыялізма, заняволіць нашы гераічныя совецкія народы. Подлыя замыслы фашысцкіх мерзаўцаў раскрыты, іх асіныя гнёзды выкарчаваны, фашысцкае звяр'ё папала ў надзейную большэвіцкую пастку. Так было. І так будзе. Зарукай нам у гэтым — няўсыпная пільнасць усяго совецкага народа, слаўных органаў НКВД і іх адважнага кіраўніка, адданага саратніка Вашага, Нікалая Іванавіча Ежова.

І мы абяцаем Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, падвоіць і патроіць нашу пільнасць, да канца выкарчаваць змяіныя рэшткі ворагаў. Мы абяцаем Вам, Іосіф Вісарыёнавіч, грудзьмі сваімі ўсе, як адзін, стаць на абарону вялікай нашай соцыялістычнай радзімы. Калі вораг адважыцца напасці на нашу зямлю, на нашы перамогі, на нашу мірную працу і на наша жыццё, тады

Мы сілы падвоім, мы храбрасць патроім,
Іх прагнасць мы іх-жа крывёю напоім, —
Як ворану вышай арла не лятаць,
Так ворагу нашай зямлі не таптаць.

Просім Вас, дарагі Іосіф Вісарыёнавіч, ад імя 8 тысяч удзельнікаў аб'яднанага перадвыбарчага схода рабочых, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых машынабудаўнічага завода імя Варашылава, скурзавода «Большэвік», кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка», швейнай фабрыкі імя Крупскай, завода «Чырвоная зара», Аўтарамонтнай станцыі, МГЭС-2, спіртзавода, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці — даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па менскай Прамысловай выбарчай акрузе.

Прыміце-ж, Іосіф Вісарыёнавіч, палкае нашае прывітанне ад усіх выбаршчыкаў менскай Прамысловай выбарчай акругі.

Прыміце гарачыя нашы пажаданні: доўгія, доўгія гады жыць і тварыць на страх ворагам, на карысць і шчасце народам вялікай соцыялістычнай радзімы, на карысць прыгнечаным народам капіталістычнага свету.

Няхай жыве наша сонечная Радзіма!

Няхай жывуць гераічныя народы вялікага Совецкага Саюза!

Няхай жыве правадыр і настаўнік, любімы друг і бацька — наш Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

(Працяг пастаноў перадвыбарчых сходаў гл. на 3 стар.).



ПРАМОВА таварыша СТАЛІНА

НА ПРЫЁМЕ Ў КРЭМЛІ РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ 17 мая 1938 года

ТАВАРЫШЫ!

Дазвольце агаласіць тост за навуку, за яе працвітанне, за здароўе людзей навукі.

За працвітанне навукі, той навукі, якая не адгароджваецца ад народа, не трымае сябе ўдалі ад народа, а гатова служыць народу, гатова перадаць народу ўсе заваяванні навукі, якая абслугоўвае народ не па прымусу, а добраахвотна, з ахвотай **(Апладысменты)**.

За працвітанне навукі, той навукі, якая не дае сваім старым і прызнаным кіраўнікам самазадаволена замыкацца ў шкарлупу жрацоў навукі, у шкарлупу манапалістаў навукі, якая разумее сэнс, значэнне, усесілле саюза старых работнікаў навукі з маладымі работнікамі навукі, якая добраахвотна і ахвотна адчыняе ўсе дзверы навукі маладым сілам нашай краіны і дае ім магчымасць заваяваць вяршыні навукі, якая прызнае, што будучыня належыць моладзі ад навукі **(Апладысменты)**.

За працвітанне навукі, той навукі, людзі якой, разумеючы сілу і значэнне ўстанавіўшыхся ў навуцы традыцый і ўмела выкарыстоўваючы іх у інтарэсах навукі, усё-ж не хочуць быць рабамі гэтых традыцый, якая мае смеласць, рашымасць ламаць старыя традыцыі, нормы, установкі, калі яны становяцца ўстарэлымі, калі яны пертвараюцца ў тормаз для руху наперад, і якая ўмее ствараць новыя традыцыі, новыя нормы, новыя ўстаноўкі **(Апладысменты)**.

Навука ведае ў сваім развіцці нямала мужных людзей, якія ўмелі ламаць старое і ствараць новае, не гледзячы ні на якія перашкоды, наперакор усяму. Такія мужы навукі, як Галілей, Дарвін і многія іншыя, агульнавядомы. Я хацеў-бы спыніцца на адным з такіх карыфееў навукі, які з'яўляецца разам з тым найвялікшым чалавекам сучаснасці. Я маю на ўвазе Леніна, нашага настаўніка, нашага выхавацеля **(Апладысменты)**. Успомніце 1917 год. На падставе навуковага аналіза грамадскага развіцця Расіі, на падставе навуковага аналіза міжнароднага становішча Ленін прышоў тады да вываду, што адзіным выхадам са становішча з'яўляецца перамога соцыялізма ў Расіі. Гэта быў больш чым нечаканы вывад для многіх людзей навукі таго часу. Плеханаў, адзін з выдатных людзей навукі, з пагардай гаварыў тады аб Леніне, сцвярджаючы, што Ленін знаходзіцца «в бреду». Іншыя не менш вядомыя людзі навукі, сцвярджалі, што «Ленін звар'яцеў», што яго належыла-б схаваць куды-небудзь падалей. Супроць Леніна вылі тады ўсе і ўсякія людзі навукі як супроць чалавека, разбураючага навуку. Але Ленін не пабаяўся пайсці супроць цячэння, супроць коснасці. І Ленін перамог **(Апладысменты)**.

Вось вам узор мужа навукі, смела вядучага барацьбу супроць устарэўшай навукі і пракладваючага дарогу для новай навукі.

Бывае і так, што новыя шляхі навукі і тэхнікі пракладваюць часам не агульнавядомыя ў навуцы людзі, а зусім невядомыя ў навуковым свеце людзі, простыя людзі, практыкі, наватары справы. Тут за агульным сталом сядзяць таварышы Стаханаў і Папанін. Людзі, невядомыя ў навуковым свеце, не маючыя вучоных ступеняў, практыкі сваёй справы. Але каму невядома, што Стаханаў і стаханаўцы ў сваёй практычнай рабоце ў галіне прамысловасці апракінулі існуючыя нормы, устаноўленыя вядомымі людзьмі навукі і тэхнікі, як устарэўшыя, і ўвялі новыя нормы, адпавядаючыя патрабаванням сапраўднай навукі і тэхнікі? Каму невядома, што Папанін і папанінцы ў сваёй практычнай рабоце на дрэйфуючай крызе мімаходам, без асобай цяжкасці, апракінулі старое ўяўленне аб Арктыцы, як ўстарэўшае, і ўстанавілі новае, адпавядаючае патрабаванням сапраўднай навукі? Хто можа адмаўляць, што Стаханаў і Папанін з'яўляюцца наватарамі ў навуцы, людзьмі нашай перадавой навукі?

Вось якія яшчэ бываюць «цуды» ў навуцы.

Я гаварыў аб навуцы. Але навука бывае ўсякая. Тая навука, аб якой я гаварыў, называецца **перадавой** навукай.

За працвітанне нашай перадавой навукі!
За здароўе людзей перадавой навукі!
За здароўе Леніна і ленінізма!
За здароўе Стаханава і стаханаўцаў!
За здароўе Папаніна і папанінцаў! **(Апладысменты)**.

Таварышу Нікалаю Міхайлавічу Шверніку

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) у дзень Вашага пяцідзесяцігоддзя шле Вам—старому большэвіку з гвардыі Леніна—свае палкае прывітанне.

Цэнтральны Камітэт ВКП(б) жадае Вам многіх год пладатворнай работы на карысць нашай партыі і працоўных Совецкага Саюза.

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ВКП(б).

АБ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

(Прамова тав. В. М. МОЛАТАВА на Першай усесаюзнай нарадзе работнікаў вышэйшай школы 15 мая г. г.)

Таварышы, дазвольце перадаць вам, Першай усесаюзнай нарадзе работнікаў вышэйшай школы і ў вашай асобе ўсім работнікам вышэйшай школы і совецкаму студэнцтву, большэвіцкае прывітанне Цэнтральнага Камітэта партыі і Совета Народных Камісараў Саюза. **(Бурныя апладысменты. Раздаюцца воклічы: «Няхай жыве наш вялікі настаўнік таварыш Сталін, ура! Няхай жыве большэвіцкая партыя! Няхай жыве верны саратнік таварыша Сталіна таварыш Молатаў!» Бурныя апладысменты).**

I. РАЗВІЦЦЕ ВЫШЭЙШАЙ АСВЕТЫ Ў СССР

Таварышы, наша вышэйшая школа прайшла да гэтага часу вельмі важны перыяд свайго развіцця. Прайшло 20 навучальных год вышэйшай школы пры совецкай уладзе. Прайшло апошняе дзесяцігоддзе, на працягу якога мы зрабілі карэнную перабудову вышэйшай школы.

У 1928 годзе пытанне аб вышэйшай школе ўстала перад намі, як адна з буйнейшых палітычных задач. Гэта стала ясна пасля выкрыцця шахцінскіх шкоднікаў з лагера буржуазных спецыялістаў. Тады выявілася з асобай сілай, як яшчэ наогул слаба совецкая краіна тэхнічнымі сіламі, як яшчэ жывучы буржуазны ўплыў і як раскінута работа замежнай агентуры ў асяроддзі старых спецыялістаў і як мы былі тады бедны кадрамі новых, сапраўды совецкіх спецыялістаў.

Як і ў іншых важных справах, таварыш Сталін быў галоўным ініцыятарам рэарганізацыі ВНУ і ВТНУ на працягу 1928—1929 гг.

Цэнтральны Камітэт большэвіцкай партыі павінен быў ушчыльную заняцца даным пытаннем. У рэзультаце гэтага сетка нашых ВНУ і колькасць навучаючыхся ў іх значна павялічыліся. Тэхнічныя і іншыя ВНУ былі перададзены наркаматам, непасрэдна зацікаўленым у падрыхтоўцы кадраў. Склад навучаючыхся ў ВНУ значна абнавіўся, у першую чаргу, за лік дзяцей рабочага класа. Удзельная вага вышэйшай школы ў грамадскім жыцці краіны значна паднялася. Вышэйшая школа стала на ногі ў адпаведнасці з новымі патрабаваннямі совецкай дзяржавы.

Ваша нарада сабралася ў момант, калі мы ўжо можам сказаць, што рэарганізацыя ВНУ ў асноўным закончана. ВНУ ў нашай краіне пабудаваны. Справа не толькі ў колькасці ВНУ і ў колькасці навучаючыхся ў іх, справа не толькі ў абноўленых навучальных праграмах, планах і т. п. Рэарганізацыя ВНУ ў асноўным завершана, завершана ў тым сэнсе, што яны пабудаваны цяпер прыстасоўна да патрабаванняў дзяржавы, будуючай соцыялізм.

Гэта не значыць, што мы ўпаўне задаволены становішчам у галіне вышэйшай асветы, што ў нас няма буйных недахопаў у гэтай справе. Наадварот, аб гэтых недахопах нам яшчэ прыдзецца гаварыць. Але цяперашнія ВНУ гэта ўжо не тыя ВНУ, якія мы мелі ў першыя годы совецкай улады і нават 10 год таму назад. Калі ўзяць у цэлым нашу вышэйшую асвету, нашы вышэйшыя школы, тэхнічныя і ваенныя, педагагічныя і медыцынскія, а таксама іншыя, то мы ўжо маем такую арганізацыю гэтай справы, якая ў асноўным адпавядае ўсім важнейшым патрэбнасцям совецкай дзяржавы. Не цяжка ўказаць на многія недахопы і, калі хочаце, на пэлыя правалы ў некаторых галінах нашай вышэйшай асветы. Для таго і склікана Усесаюзная нарада работнікаў вышэйшай школы, каб яна дапамагла разгарнуць барацьбу з гэтымі недахопамі па-сапраўднаму, з усёй энергіяй і арганізаванасцю. Ваша задача палегчана тым, што сетка асноўных вышэйшых навучальных устаноў пабудавана, што ўся справа вышэйшай асветы атрымала ўжо дастойны Совецкага Саюза размах і ў нас ёсць усё неабходнае для далейшага развіцця вышэйшай школы, для росквіту вышэйшай асветы.

Параўнайце становішча нашай вышэйшай школы з вышэйшай школай капіталістычных дзяржаў і вы ўбачыце каласальную розніцу ў карысць СССР. Лёс вышэйшай школы ў капіталістычных дзяржавах і ў Совецкім Саюзе, як і ўсякае іншае буйнае грамадскае з'явішча, адлюстроўвае карэннае адрозненне ў развіцці двух светаў — капіталістычнага і соцыялістычнага. У краінах капіталізма вышэйшая школа перажывае цяжкую пару крызісу, заняпаду. Іншая справа ў СССР. У нас адваротная карціна.

Возьмем маючыяся ў друку апошнія даныя аб вышэйшай школе ў капіталістычных краінах. Атрымліваем такую карціну аб ліку навучаючыхся ў ВНУ: ва Францыі і ў Германіі па 74 тыс., у Італіі — 73 тыс., у Вялікабрытаніі (па метраполіі) — 51 тыс. Ва ўсіх чатырох так называемых «вялікіх дзяржаў» Еўропы, разам узятых, колькасць навучаючыхся ў ВНУ дасягае 270 тысяч. Дададзім да гэтага, што колькасць навучаючыхся ў ВНУ Японіі складае 146 тысяч. Такім чынам, у Германіі, Італіі, Англіі, Францыі і Японіі, разам узятых, колькасць навучаючыхся ў ВНУ складае некалькі больш 400 тысяч. Параўнайце са становішчам у СССР. Адзін Совецкі Саюз з яго 550 тыс. навучаючыхся ў вышэйшай школе мае студэнтаў больш, чым усе ВНУ вялікіх дзяржаў Еўропы разам з Японіяй. **(Апладысменты).** Мы маем права ганарыцца такім становішчам. Рабочы клас, сялянства і інтэлігенцыя Совецкага Саюза могуць ганарыцца тым, што наша вышэйшая школа стаіць на высокім узроўні развіцця, што рабоча-сялянская дзяржава праяўляе да гэтай справы такія клопаты, якія не па плячу шаноўным буржуазным дзяржавам. **(Апладысменты).**

Вы ведаеце таксама, што для раду буржуазных дзяржаў характэрна, што за апошнія годы колькасць ВНУ і навучаючыхся ў іх не толькі не павялічваецца, а скарачаецца. Вышэйшая школа ў буржуазных краінах не толькі недаступна працоўным, але яна ў многіх выпадках перажывае заняпад у параўнанні нават з ранейшымі годамі.

Не глядзячы на гэта, ва ўсіх буржуазных краінах расце беспрацоўе сярод вучоных прафесій. Гэта адносіцца не толькі да Еўропы, але і да Амерыкі. Ёсць ужо такія галіны інтэлігентнай працы, дзе палова спецыялістаў з вышэйшай асветай астаецца без работы, а зачастую і без забяспечанага кавалка хлеба. Пашукайце-тка ў нас беспрацоўнага вучонага, беспрацоўнага спецыяліста! Калі-б хто-небудзь знайшоў у нас беспрацоўнага вучонага, мы-б яму далі прэмію! **(Апладысменты, смех).** У нас адваротнае становішча. Совецкая вышэйшая школа выпускае цяпер ужо штогод да ста тысяч спецыялістаў, а ў нас усё яшчэ вялікі недахоп у спецыялістах ва многіх галінах работы. У нашых умовах такія рэчы, як «беспрацоўе вучоных прафесій» гучаць проста дзіка.

Гавораць і так, што людзі вучоных прафесій у капіталістычных краінах пакараны цяжкім беспрацоўем за тое, што многія з іх вельмі доўга праяўляюць няздольнасць зразумець рэакцыйнасць і гніласць сучаснага капіталізма. У гэтай заўвазе ёсць зярно праўды. Вучоныя людзі і спецыялісты буржуазнага грамадства — выхадцы з маёмных слаёў, з буржуазных і дробна-буржуазных класаў. Ад гэтага грамадства зараз нельга чакаць добрага, перадавога грамадскага выхавання. Таму буржуазныя і дробна-буржуазныя інтэлігенты нярэдка адзначаюцца няздольнасцю зразумець, што капіталістычны лад ужо аджыў свой век. Многія з іх прадаўжаюць чапляцца за гэты лад, а ён жорстка адплачвае ім ростам беспрацоўя сярод вучоных прафесій. Але калі рабочыя і многія сяляне ў буржуазных краінах усё больш пранікаюцца рэволюцыйным адмаўленнем капіталізма, то па гэтаму шляху немінуча павінна пайсці і ўсё большая частка інтэлігенцыі, у першую чаргу з яе дэмакратычных слаёў.

Капіталізм ужо ва многіх краінах, можна сказаць, дабіўся таго, што ў рабочым класе ён мае свайго непрымірымага ворага. Колькасць незадаволеных расце не толькі сярод рабочых, але і сярод сялян, сярод дробных служачых, сярод саматужнікаў. Колькасць незадаволеных расце і сярод інтэлігентных прафесій, настаўнікаў, урачоў, інжынераў, аграномаў, прафесараў, пісьменнікаў, вучоных. Усё большая колькасць людзей у буржуазных краінах, у тым ліку і сярод выхадцаў з прывілегіраваных слаёў грамадства, з вучоных прафесій, з інтэлігенцыі, пераконваецца ў тым, што капіталізм ужо не здолен забяспечыць развіццё культуры, развіццё навукі, не здолен служыць справе прагрэса. Гэтыя людзі звяртаюць свае погляды ў наш бок. Але мала пераканацца ў няздольнасці капіталізма служыць справе прагрэса, мала і таго, каб зразумець небяспеку фашызма, які параджаецца сучасным гніючым на карні капіталізмам. Трэба яшчэ знайсці дарогу з капіталізма да новага ладу. І вось гэта выклікае цікавасць да Совецкага Саюза, да нашай работы, да нашага культурнага будаўніцтва, да развіцця тэхнікі і навукі ў СССР. Нас вывучаюць, на нашым прыкладзе правяраюць сваю крытыку капіталізма і шляхі пабудовы новага грамадства. Усё гэта накладае на нас адказнасць не толькі перад грамадскай думкай нашай краіны, але і перад грамадскай думкай усяго прагрэсіўнага чалавецтва. **(Бурныя апладысменты).**

II. РАШАЮЧАЯ ЗАДАЧА ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЫ Ў НАШЫ ДНІ


На вашай нарадзе многа гаварылася аб недахопах нашай вышэйшай школы. І гэта правільна. Гэтых недахопаў не мала. Разам з ростам нашых патрабаванняў да вышэйшай школы гэтыя недахопы нам становяцца больш яснымі, а гэтыя патрабаванні растуць і будуць расці і далей.

Пабудаваўшы магутную сетку вышэйшых навучальных устаноў у адпаведнасці з гіганцкімі патрабаваннямі дзяржавы, мы яшчэ далёка не навялі належнага парадку ў гэтай справе. За якую-б галіну вышэйшай школы мы не ўзяліся, мы гэта адчуваем на кожным кроку.

Вазьміце планаванне ў будаўніцтве вышэйшых навучальных устаноў. У нас ёсць значныя галіны народнай гаспадаркі і культуры, якія дрэнна забяспечаны падрыхтоўкай кадраў спецыялістаў. Стан падрыхтоўкі нацыянальных кадраў спецыялістаў у радзе рэспублік таксама нездавальняючы. Многае яшчэ недароблена ў гэтай галіне.

Пытанням навучальных планаў і праграм у вышэйшай школе ваша нарада аддала вялікую ўвагу. Гэта было неабходна. Трэба пакончыць з частымі зменамі навучальных планаў і праграм, унесці ўстойлівасць у гэту справу. Разабрацца ва ўсім гэтым, устанавіўшы адпавядаючыя сучасным патрабаванням навучальныя праграмы і пакончыўшы з залішняй, затрудняючай вучобу многапрадметнасцю, значыць — ліквідаваць рад шкодніцкіх агіднасцей, сур'ёзна перашкаджаючых развіццю вышэйшай школы.

Цяпер вазьміце пытанне аб кіруючых кадрах ВНУ. Падбору дырэктараў і прафесарска-выкладчыцкіх кадраў аддавалася ў апошні час нямала ўвагі. Але і ў гэтай галіне многа слабых месц. Мала падабраць, трэба яшчэ кіраваць гэтымі кадрамі. Між тым Галоўныя ўпраўленні вышэйшых навучальных устаноў нярэдка працуюць вельмі слаба. Ды і Камітэту вышэйшай школы трэба яшчэ многа папрацаваць



над падборам кіруючых кадраў ВНУ і над правільным правядзеннем штатнаакладной сістэмы.

Параўнаўча мала тут гаварылася аб студэнцкіх арганізацыях. Між тым у вышэйшай школе яны граюць важную ролю. Ад іх работы многае залежыць у стварэнні спрыяючых умоў для вучобы, у забеспячэнні свядомай дысцыпліны сярод студэнцтва, у грамадскім выхаванні моладзі. Нельга не адзначыць сказаную на гэтай нарадзе прамову студэнткі Макаравай. Сваім выступленнем, у прыватнасці наконт абыякавых адносін кіраўнікоў вышэйшых навучальных устаноў да новапаступаючых у вышэйшую школу, тав. Макарава падкрэсліла, наколькі яшчэ ў нас моцны бюракратызм, бяздушныя адносіны да навучаючайся моладзі. Яна справядліва таксама абараніла сваю бібліятэчную ВНУ, таму што ў нашай краіне, дзе ў народзе развіліся такія велізарныя патрэбнасці ў кнізе, у ведах, бібліятэчная справа набыла вялікае дзяржаўнае значэнне. Трэба, каб студэнцкія арганізацыі больш давалі аб сабе ведаць у патрэбных выпадках.

Работа Камітэта вышэйшай школы павінна сказацца яшчэ і ў будаўніцтве вышэйшых навучальных устаноў, і ў клопатах аб тэхнічнай базе вышэйшай школы, і ў далейшым паляпшэнні бытавых умоў студэнцтва, і ў многім іншым. Мацней павінны адчуць дапамогу з боку Камітэта і нашы наркаматы. Але ўжо цяпер можна сказаць, што ў параўнанні з першым перыядам работы Камітэта, калі да кіраўніцтва прабраліся буржуазныя пераражэнцы-шкоднікі, Камітэт запрацаваў па-новаму. **(Апладысменты).**

Можна і трэба гаварыць аб многіх недахопах у вышэйшай школе. Іх сапраўды многа. У дакладах і прамовах на гэтай нарадзе гаварылі аб гэтым. Але зараз неабходна сканцэнтраваць увагу на галоўным. Трэба прызнаць, што сярод усіх недахопаў вышэйшай школы галоўным у даны момант з'яўляецца **недахоп добрых падручнікаў.** Гэта прызнаюць і прафесары і студэнты. Аб недахопе падручнікаў тут гаварылася нямала. Але трэба гэта пытанне паставіць не побач з іншымі, а ў якасці пытання першаступеннай важнасці.

У нас не мала падручнікаў. Ёсць старыя няпрэнныя падручнікі, ёсць і абноўленыя добрыя падручнікі. Падрыхтоўваецца выданне новых і новых. На 1938 год намечан вялікі план выдання падручнікаў. Але гэта зусім не значыць, што ўказаны план выдання падручнікаў колькі-небудзь сур'ёзна падрыхтаваны. Гэты план трэба падвергнуць праверцы, не зводзячы справу да фармальнага зацвярджэння. Справядліва таксама ўказанне на тое, што нават падрыхтаваныя падручнікі не заўсёды забяспечваюцца своечасовым выданнем. Але галоўнае пытанне ляжыць не ў выдавецкай галіне. На цэнтр неабходна паставіць на падрыхтоўцы, на складанні падручнікаў. Наколькі сур'ёзна пытанне аб падручніках, адпавядаючых нашым цяперашнім патрабаванням, вы ведаеце па прыкладу выдання аднаго падручніка для сярэдняй школы. Складзены прафесарам Шэстаковым і яго групай падручнік гісторыі СССР атрымаў, як вядома, не першую, а другую прэмію. Але каб атрымаць гэты падручнік, над ім нямала прышлося папрацаваць і Цэнтральнаму Камітэту ВКП(большэвікоў). **(Апладысменты).**

Каб па-сапраўднаму забяспечыць выданне добрых падручнікаў, трэба праробіць вельмі вялікую работу. Трэба перш за ўсё ўмела сабраць неабходныя для гэтага навукова-выкладчыцкія сілы. Трэба многа, настойліва і сур'ёзна папрацаваць над іх арганізацыяй па адпаведных галінах. Ажыццявіць правільнае кіраўніцтва гэтай справай, значыць — правесці сапраўды сур'ёзную і вельмі разумную работу.

Нам патрэбен падручнік, адпавядаючы сучасным патрабаванням. Ён павінен быць на ўзроўні сучаснай навукі і зусім даступны навучаючымся па сваёй мове. Ён павінен даць неабходны аб'ём ведаў і разам з тым падрыхтоўваць навучаючагася да яго будучай практычнай дзейнасці. Ён павінен шырока скарыстаць ранейшыя нашы падручнікі і замежныя падручнікі, дзе вельмі многа каштоўнага для вучобы, і разам з тым ён павінен у неабходнай меры адпавядаць задачам ідэйна-палітычнага выхавання моладзі. Вышэйшая школа павінна мець і будзе мець добры совецкі падручнік. **(Апладысменты).**

Што студэнты ў гэтым адчуваюць патрэбу — няма чаго даказваць. Дастаткова сказаць, што не знойдзецца такіх ВНУ, якія былі-б па-сапраўднаму забяспечаны добрымі падручнікамі. Студэнты прагнуць атрымаць добры совецкі падручнік. Яны зачакаліся яго. Такі падручнік аблегчыць і ўсю работу прафесуры ВНУ. Без адпаведных падручнікаў нават добрае выкладанне часткова абясцэньваецца, а з гэтым нельга мірыцца. Стаіць пытанне і аб выданні падручнікаў па такіх тэмах, як Сталінская Канстытуцыя, калгаснае будаўніцтва, соцыялістычнае планаванне, народна-гаспадарчы ўчот і інш.

Мы можам цяпер па-сур'ёзнаму паставіць пытанне аб падручніках для вышэйшай школы. У нас ёсць навукова-выкладчыцкія кадры, якія з гонарам справяцца з гэтай вялікай задачай. Прафесары і выкладчыкі, старыя вучоныя і маладыя навуковыя работнікі павінны ўзяцца за гэту справу, як за адну з важнейшых і неадкладных дзяржаўных задач. Мы абавязаны стварыць для гэтага неабходныя арганізацыйныя прадпасылкі, аблегчыць работу адпаведных аўтараў і аўтарскіх груп. Тут знойдзецца работа для многіх, работа цікавая і выключна каштоўная для совецкай дзяржавы. Можна не сумнявацца, што гэта работа прывядзе да больш сур'ёзнай крытычнай праверкі нашых вучэбных праграм і планаў і паставіць рад новых пытанняў у вышэйшай школе, ды і ў галіне навукі. Пакуль мы арганізуем выданне гэтых падручнікаў, нам прыдзецца яшчэ многа перавыдаваць старых падручнікаў. Нават тых, якія нас ужо далёка не задавальняюць. Трэба прызнаць, што вышэйшая школа адчувае патрэбу ў новых падручніках, у такіх совецкіх падручніках, якія дадуць ёй моцную базу для далейшага развіцця. Калі ў мінулым большэвікам многа прыходзілася займацца агітацыйнымі брашурамі і рэзалюцыямі, то цяпер нашы задачы паскладаней, і няхай лепш будзе паменш рэзалюцый, але больш добрых совецкіх падручнікаў. **(Апладысменты).**

Калі ў гэтым пытанні ваша нарада дасць належны штуршок, яна зробіць вялікую справу. Нельга забываць аб многіх недахопах у вышэйшай школе, але трэба аддаць адчот, у чым тут заключаецца галоўны недахоп. Тады нам будзе ясна, што тут **рашаючая задача** заключаецца ў тым, каб **забяспечыць вышэйшую школу добрымі падручнікамі,** дастойнымі нашай вялікай справы, справы соцыялізма. Тады мы безумоўна ўзнімем нашу вышэйшую школу на новую, больш высокую ступень і яшчэ лепш заблішчыць сваімі новымі поспехамі. **(Апладысменты).**

III. ЗНАЧЭННЕ ІДЭЙНА-ПАЛІТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

Чаму мы, большэвікі, надаем такое вялікае значэнне ідэйна-палітычнаму выхаванню? Чаму? Таму, што размах нашай справы, размах справы соцыялізма, патрабуе гэтага. Размах нашай справы настолькі вялікі, праводзімая совецкай уладай перабудова жыцця ўносіць такія карэнныя змены, што ў нашых умовах нельга замыкацца толькі ў штодзённыя справы і бягучыя патрэбы, а неабходна свядома адносіцца да генеральнага шляху нашага развіцця, да гістарычных падзей, удзельнікамі якіх мы з'яўляемся. Мы, большэвікі, лічым, што верным компасам у гістарычных падзеях можа служыць ленінізм, які раскрывае іх сапраўдную сугнасць. Авалодаць ленінізмам — у гэтым важнейшая задача работнікаў вышэйшай школы, у гэтым важнейшая задача совецкага студэнцтва.

Каб растлумачыць сваю мысль, я спынюся на тым, як ленінізм разумее задачу пераходу ад капіталізма да соцыялізма. Ленінізм вучыць, што соцыялізм можна пабудаваць толькі з таго матэрыялу, які пакінуў нам капіталізм, што соцыялізм можна пабудаваць рукамі не нейкіх там штучна вырашчаных, па-за капіталістычным грамадствам выхаваных, «чысценькіх», праведнікаў — соцыялістаў, якіх у жыцці няма і не можа існаваць, а рукамі тых людзей, якія існуюць, з іх сапраўднымі недахопамі і дастоінствамі, якія выраслі і выхоўваліся ў нетрах самога капіталістычнага грамадства. Аб вялікім значэнні гэтых ленінскіх мысляў нам гавораць усё новыя і новыя факты нашага часу. Таму я працытую тут адно з выдатных выказванняў В. І. Леніна па гэтаму пытанню. Бяру артыкул Леніна «Поспехі і труднасці Совецкай улады», напісаны ў сакавіку 1919 года. Вось што пісаў тут Ленін:

«Старыя соцыялісты-утапісты вабражалі, што соцыялізм можна пабудаваць з другімі людзьмі, што яны спачатку выхаваюць прыгожанькіх, чысценькіх, добра абучаных людзей і будуць будаваць з іх соцыялізм. Мы заўсёды смяяліся і гаварылі, што гэта кукальная ігра, што гэта забава кісейных паненак ад соцыялізма, але не сур'ёзная палітыка.

Мы хочам пабудаваць соцыялізм з тых людзей, якія выхаваны капіталізмам, ім сапсаваны, разбэшчаны, але затое ім і загартаваны ў барацьбе. Ёсць пролетарыі, якія загартаваны так, што здольны пераносіць у тысячу разоў большыя афяры, чым любая армія; ёсць дзесяткі мільёнаў прыгнечаных сялян, цёмных, раскіданых, але здольных, калі пролетарыят павядзе ўмелую тактыку, вакол яго аб'яднацца ў барацьбе. І затым ёсць спецыялісты навукі, тэхнікі, усе наскрозь прасякнутыя буржуазным светасузіраннем, ёсць ваенныя спецыялісты, якія выхаваліся ў буржуазных умовах, — і добра яшчэ, калі ў буржуазных, а то ў памешчыцкіх, у палачных, у прыгонніцкіх. Што датычыць народнай гаспадаркі, то ўсе аграномы, інжынеры, настаўнікі — усе яны браліся з маёмнага класа; не з паветра яны ўпалі! Немаёмны пролетарый ад станка і селянін ад сахі прайсці універсітэта не маглі, ні пры цару Нікілаю, ні пры рэспубліканскім прэзідэнце Вільсоне. Навука і тэхніка — для багатых, для маёмных; капіталізм дае культуру толькі для меншасці. А мы павінны пабудаваць соцыялізм з гэтай культуры. Іншага матэрыялу ў нас няма. Мы хочам будаваць соцыялізм неадкладна з таго матэрыялу, які нам пакінуў капіталізм з учора на сёння, цяпер-жа, а не з тых людзей, якія ў парніках будуць прыгатоўлены, калі забаўляцца гэтай пабасенкай. У нас ёсць буржуазныя спецыялісты, і больш нічога няма. У нас няма іншых цаглін, нам будаваць няма з чаго. Соцыялізм павінен перамагчы, і мы, соцыялісты і комуністы, павінны на справе даказаць, што мы здольны пабудаваць соцыялізм з гэтых цаглін, з гэтага матэрыялу, пабудаваць соцыялістычнае грамадства з пролетарыяў, якія культурай карысталіся ў мізэрнай колькасці, і з буржуазных спецыялістаў.

Калі вы не пабудуеце комуністычнага грамадства з гэтага матэрыялу, тады вы пустыя фразёры, балбатуны.

Вось як пытанне пастаўлена гістарычнай спадчынай сусветнага капіталізма! Вось тая труднасць, якая стала перад намі канкрэтна, калі мы ўзялі ўладу, калі мы атрымалі совецкі апарат!

Гэта адна палова задачы, і гэта большая палова задачы. Совецкі апарат значыць, што працоўныя аб'ядналі так, каб вагой свайго масавага аб'яднання раздавіць капіталізм. Яны яго і раздавілі. Але ад раздаўленага капіталізма сыт не будзеш. Трэба ўзяць усю культуру, якую капіталізм пакінуў, і з яе пабудаваць соцыялізм. Трэба ўзяць усю навуку, тэхніку, усе веды, мастацтва. Без гэтага мы жыццё комуністычнага грамадства пабудаваць не можам. А гэта навука, тэхніка, мастацтва — у руках спецыялістаў і ў іх галовах.

Так пастаўлена задача ва ўсіх галінах — задача супярэчлівая, як супярэчлівы ўвесь капіталізм, найцяжэйшая, але выканальная. Не таму, што мы выхаваем чысценькіх комуністычных спецыялістаў год праз дваццаць: першае пакаленне комуністаў без плямы і папроку; не, выбачце, нам трэба ўсё наладзіць цяпер, не праз дваццаць год, а праз два месяцы, каб змагацца супроць буржуазіі, супроць буржуазнай навукі і тэхнікі ўсяго свету. Тут мы павінны перамагчы. Масавай вагой сваёй прымусіць буржуазных спецыялістаў служыць нам — цяжка, але можна; і калі мы гэта зробім, мы пераможам».

Вы бачыце, што Ленін з самага пачатку зусім акрэслена ставіў пытанне аб тым, як іменна, з якога іменна матэрыялу можна пабудаваць соцыялізм, і вы бачыце, як мы ўжо далёка прасунуліся па гэтаму шляху. Ён жорстка высмейваў разважанні на тэму аб тым, што для будаўніцтва соцыялізма спачатку трэба выхаваць «прыгожанькіх, чысценькіх, добра абучаных людзей», «людзей, якія ў парніках будуць прыгатоўлены». Апракідваючы гэтыя разважанні едкай насмешкай, ён гаварыў: «Мы хочам пабудаваць соцыялізм з тых людзей, якія выхаваны капіталізмам, ім сапсаваны, разбэшчаны, але за тое ім і загартаваны ў барацьбе». Ён указваў на тое, што ў капіталістычным грамадстве побач з буржуазіяй і іншымі панамі становішча існуюць пролетарыі, з якіх капіталізм выкоўвае гераічную армію змагароў за соцыялізм і якія пры ўмелай тактыцы могуць павесці за сабой мільёны сялян і дробнага гарадскога люду. Але ён указваў таксама і на тое, што гэтага недастаткова, што неабходна ўключыць у справу будаўніцтва соцыялізма, які ідзе на змену капіталістычнаму грамадству, інжынераў, настаўнікаў, аграномаў і іншых інтэлігентаў, якія вышлі з маёмных класаў, выхаваны ў буржуазным духу. Ленін указваў, што без прыцягнення буржуазных спецыялістаў нельга прыступіць да будаўніцтва соцыялізма. Ён ужо тады гаварыў: «У нас няма іншых цаглін, нам будаваць няма з чаго. Соцыялізм павінен перамагчы, і мы, соцыялісты і комуністы, павінны на справе даказаць, што мы здольны пабудаваць соцыялізм з гэтых цаглін, з гэтага матэрыялу, пабудаваць соцыялістычнае грамадства з пролетарыяў, якія культурай карысталіся ў мізэрнай колькасці, і з буржуазных спецыялістаў». Ленін без абінякоў гаварыў: «Трэба ўзяць усю культуру, якую капіталізм пакінуў, і з яе пабудаваць соцыялізм. Трэба ўзяць усю навуку, тэхніку, усе веды, мастацтва. Без гэтага мы жыццё комуністычнага грамадства пабудаваць не можам». Ленін указаў шлях, якім стварыць новае з старога, як скарыстаць стары матэрыял у інтарэсах новага грамадства. Мы ішлі па гэтаму шляху, па шляху ленінізма, і вы бачыце: соцыялізм перамог. **(Бурныя апладысменты).**

Але, каб будаваць з гэтага матэрыялу новае грамадства, трэба ясна бачыць мэту і шляхі яе ажыццяўлення. Абмежаваўшы свой кругазор прывычнымі ў буржуазным грамадстве разуменнямі і штодзённымі дробнымі клопатамі, нельга зразумець пастаўленай гісторыяй перад людзьмі нашай эпохі карэннай задачы, „задачы перабудовы і абнаўлення грамадства. Без засваення такога вучэння, як марксізм-ленінізм, асвятляючага генеральны шлях гістарычнага развіцця, раскрываючага сэнс сучасных падзей, нельга быць свядомым удзельнікам гістарычных падзей нашага часу.

Гэта не значыць, што дастаткова запісацца ў комуністы, наляпіўшы на сябе адпаведны ярлык, і гэтым атрымаем права на імя перадавога чалавека нашай эпохі. Мы цяпер добра ведаем, што пад комуністаў, пад абаронцаў ленінізма, падфарбоўваюцца і злейшыя нашы ворагі. Таго-сяго з такіх людзей падзеі нават на час захапляюць і ўзнімаюць высока. Але фальш рана ці позна ўсёроўна выявіцца. У вялікіх падзеях нашай эпохі часам на паверхню выплываюць, граючы пэўную ролю і розныя лоўкія людзі, накідваючыя на сябе маску спачування соцыялізму, а на самой справе не верачыя ў тое, што можна жыць без падачак ад паноў з тугой машной, без прыслужніцтва буржуазіі.

Пасля падзей апошняга часу мы добра ведаем, што сярод гэтых прымазаўшыхся да совецкай улады і большэвіцкай партыі людзей было нямала старых і новых платных агентаў буржуазіі, агентаў белагвардзейшчыны і замежных разведак. Трэба прызнаць, што мы праявілі недапушчальную даверлівасць да многіх з іх, што мы, нават змагаючыся з імі, занадта доўга лічылі іх ідэйнымі людзьмі, прадстаўляючымі палітычную плынь. На самой справе ўсе гэтыя трацкісты, бухарынцы і ім падобныя даўно ўжо ператварыліся ў банду шпікаў і забойц, шкоднікаў і дыверсантаў. У гэтым асяроддзі аказалася нямала мацёрых агентаў царскай ахранкі, растленных правакатараў і здраднікаў, за мізэрную мзду выконваўшых гнуснейшыя даручэнні белагвардзейскіх і замежных разведак, старанна поўзаўшых перад імі на бруху. Гэтым панам прышлося выкручвацца ў двурушніцтве, прышлося пазмяінаму выкручвацца ў здрадніцтве. Усе гэтыя паны, імёны якіх вам вядомы па апошніх судовых працэсах, паказаны цяпер перад усім светам у іх сапраўдным выглядзе,

(ПРАЦЯГ НА 3 СТАР.)

ПРАЦЯГ ПРАМОВЫ ТАВАРЫША В. М. МОЛАТАВА АБ ВЫШЭЙШАЙ ШКОЛЕ

без масак, і вы ведаеце, што больш агіднага відовішча, чым гэты чалавечы хлам, здаецца, нельга ўявіць.

Ды гэта-ж і ёсць тыя людзі, якіх старое грамадства, пануючыя класы капіталізма хацелі-б мець у нашым асяроддзі, каб разлагаць нашу справу, каб падрываць яе поспехі. Гэта людзі, праз якіх буржуазія яшчэ імкнулася і імкнецца вярнуцца зноў да ўлады, расчысціць зноў месца для свайго панавання. Уся гэта зграя забойцаў, шпікаў і шкоднікаў была апошняй стаўкай буржуазіі. На іх падрыўную і разлагаючую двурушніцкую работу разлічвалі белагвардзейцы і меншавікі, эсэры і замежныя шпіёны-разведчыкі. Нічога ідэйна больш высокага, маральна больш моцнага ў старога грамадства для барацьбы з соцыялізмам не асталося. Усе гэтыя трацкісты і бухарынцы разам з іх падручнымі ўсякага роду— нішто іншае як атрэб'е буржуазнага грамадства, яго агентура, прадстаўляюць ідэйны і маральны воблік гэтага грамадства, калі яшчэ дазвольна тут гаварыць аб якіх-небудзь ідэях, аб якой-небудзь маралі. Мы добра ведаем цяпер, хто гэтыя людзі, прастытуіраваныя да канца. Яны ў сваім агідным аголеным абліччы адлюстроўваюць ідэйна-маральны воблік гніючых, дажываючых свой век буржуазных класаў. Мы і адправілі іх туды, куды гісторыя ў не такім аддаленым будучым адправіць, мабыць, і само капіталістычнае грамадства. **(Бурныя апладысменты).**

Ленін указваў на тое, што пабудова соцыялізма з матэрыялу, пакінутага капіталізмам, задача супярэчлівая. Старое не ўступае дарогу новаму без бою, без упартай барацьбы. З другога боку, новае, а значыць і новыя людзі, могуць вырасці і загартавацца толькі ў барацьбе з гэтым старым, смела расчышчаючы дарогу соцыялізму. Каб забяспечыць магчымасць разабрацца ў гэтых супярэчнасцях, знайсці правільны шлях і ісці разам з перадавымі людзьмі нашага часу, патрэбна пастаянная работа па ідэйна-палітычнаму выхаванню мас, па ідэйна-палітычнаму выхаванню моладзі, а таксама самых кіруючых кадраў і спецыялістаў усіх галін. Тады не прыдзецца доўга чакаць таго моманту, калі мы разгромім да канца ўсіх і ўсякіх буржуазных перараджэнцаў, як-бы яны ні двурушнічалі, ні злаўчаліся, ні выкручваліся. **(Апладысменты).** У нас быстра расце і мацнее апора нашай справы ў народных масах. Апора нашай справы — нашы стаханаўцы і ўдарнікі заводаў, фабрык і калгасаў, героі працы, тэхнікі і навукі, героі ваеннай справы, авіяцыі і Арктыкі, растучая ў сваіх ведах і грамадскім вопыце совецкая моладзь. **(Апладысменты).** Перад няўхільным ростам гэтых сіл патугі нашых ворагаў бяссільны. Жаданне свядома ўдзельнічаць у радах будаўнікоў новага грамадства і чэсна служыць да канца сваёй радзіме ўсё больш захватвае людзей усіх пакаленняў нашай краіны.

Урокі апошніх палітычных выкрываўчых судовых працэсаў вельмі істотны. Цяпер мы асабліва добра запомнілі ўказанне таварыша Сталіна аб тым, як небяспечна ў наш час палітычная бясклапатнасць. Папоўніліся і нашы прадстаўленні ў пытанні аб дзяржаве, у пытанні аб дзяржаве наогул і аб соцыялістычнай дзяржаве, якая знаходзіцца ў знешне капіталістычным акружэнні, у прыватнасці. Больш чым калі-б там ні было мы зразумелі палітычную роль шпіёнскіх разведак замежных дзяржаў і разам з тым неабходнасць сваёй уласнай добрай разведкі. Нашы прадстаўленні ў пытанні аб дзяржаве сталі яшчэ больш канкрэтнымі, і гэта палегчыць нам больш правільнае скарыстанне апарата дзяржавы ў справе будаўніцтва новага, комуністычнага, грамадства.

З барацьбы з ворагамі народа мы выйшлі зусім не аслабленымі. Наадварот, мы яшчэ больш умацаваліся і яшчэ больш упэўнены ў поўнай перамозе нашай справы. **(Апладысменты).**

Як адбіліся гэтыя падзеі на нашай практычнай рабоце, можна меркаваць хоць-бы па такому прыкладу. Я маю на ўвазе работу прамысловасці ў гэтым годзе. За 1937 год, у рэзультаце выкрыцця шкодніцтва, нам прышлося зрабіць значную змену кадраў у прамысловасці. Замест многіх, якія празмерна кічыліся сваім доўгім вопытам, а на справе палітычна перарадзіліся і заблыталіся ў шкодніцтве, «комуністаў» і інжынераў-спецыялістаў, нам прышлося за апошнія месяцы вылучыць многа новых людзей, галоўным чынам, з нявідных раней практыкаў і маладых спецыялістаў. У некаторых галінах прамысловасці прышлося замяніць цэлы слой палітычна прагніўшых работнікаў. Цяпер можна ўжо меркаваць аб першых выніках гэтага абнаўлення кіруючых кадраў у прамысловасці.

Як вядома, 30 лістапада 1937 года была апублікавана вытворчая праграма прамысловасці на 1938 год. Гэта праграма прадугледжвала рост прадукцыі прамысловасці ў гэтым годзе на 15,3 проц. супроць мінулага года. Пры цяперашніх маштабах нашай прамысловасці такі рост прамысловай прадукцыі за адзін год прадстаўляе аграмадную велічыню, не гаворачы ўжо аб тым, што гэта ярка падкрэслівае перавагу соцыялістычнага ладу перад капіталістычным, дзе зноў разгортваецца глыбокі эканамічны крызіс. Ці спраўляюцца з пастаўленай задачай нашы цяперашнія гаспадарчыя кадры?

Параўнаем вытворчую прадукцыю студзеня гэтага года са студзенем мінулага года. Аказваецца, у студзені мы мелі павелічэнне прадукцыі супроць студзеня 1937 года на 5,5 проц. Мы пайшлі наперад, але павелічэнне супроць мінулага года было яшчэ параўнальна невялікае. Люты гэтага года даў павелічэнне прамысловай прадукцыі на 6 проц. супроць лютага мінулага года. Гэтым быў зроблен далейшы крок наперад. Сакавік супроць сакавіка мінулага года даў павелічэнне прамысловай прадукцыі ўжо на 12 проц. Нарастанне тэмпаў росту прамысловасці тут дастаткова відаць. Цяпер мы маем даныя і аб красавіку месяцы. Красавік даў павелічэнне прамысловай прадукцыі супроць красавіка мінулага года на 15 проц. **(Бурныя апладысменты).**

Як бачыце, наша прамысловасць увайшла ўжо ў русло выканання гадавога плана. Гэта не значыць, што ў нас няма адсталых і дрэнна працуючых галін прамысловасці. Ні аб якім заспакаенні на дасягнутым узроўні не можа быць і гутаркі. Але вам зразумела, што такі ўздым і такое нарастанне тэмпаў росту прамысловасці можа адбывацца толькі на здаровай аснове. На нашых вачах новыя кадры авалодваюць кіраўніцтвам прамысловасцю. Змена палітычна правалішыхся кіраўнікоў, расчыстка гаспадарчага апарата ад ворагаў-шкоднікаў зусім не паслабіла прамысловасць. Новыя кадры падбіраюць ужо да рук даручаную справу, паспяхова спраўляючыся з ёй. Гэта паказальнік таго, як выраслі нашы гаспадарчыя кадры, якія рэзервы мы ўжо маем і як упэўнена мы можам рухацца наперад, арганізуючы правільнае вылучэнне новых сіл, правільнае выхаванне і кіраўніцтва імі. Падобныя поспехі сталі магчымымі дзякуючы таму, што ўвесь рабочы клас і ўся маса працоўных нашай краіны быстра расце ў сваёй грамадскай свядомасці і ў сваім уменні арганізаваць працу. У нас усе дзеці ахоплены пачатковай школай, і быстра расце сярэдняя асвета. Тое, што сярэдняя школа стала даступна для мільёнаў юнакоў і дзяўчат, мае велізарнае значэнне. Тое, што вышэйшая школа зрабіла за апошнія годы ў падрыхтоўцы новых кадраў спецыялістаў, пачынае ўжо даваць свае сур'ёзныя плады. Мы павінны даражыць кожным старым спецыялістам і берагчы іх, але галоўнай сілай сярод кваліфікаваных спецыялістаў сталі ўжо спецыялісты новага пакалення, лік якіх расце з кожным днём.

Наколькі ў культурных адносінах выраслі ўжо народы Совецкага Саюза, наколькі выраслі і кадры нашых спецыялістаў, мы бачым на кожным кроку па фактах, якія адносяцца да нашага гаспадарчага фронта. Мы ўсяляк імкнуліся і імкнемся прадоўжыць перыяд мірнай перадышкі — на гэта заўсёды былі накіраваны намаганні совецкай улады і большэвіцкай партыі, намаганні нашага вялікага кіраўніка і правадыра народаў таварыша Сталіна. **(Бурныя працяглыя апладысменты. Усе ўстаюць).**

Мы не дарма пражылі гэтыя годы мірнай перадышкі. Ужо нямала зроблена ў справе падрыхтоўкі новых совецкіх кадраў спецыялістаў. У гэтай галіне цяпер рашае справу ідэйна-палітычнае выхаванне. Яшчэ год таму назад таварыш Сталін гаварыў:

«Цяпер вузлавым пытаннем для нас з'яўляецца не ліквідацыя тэхнічнай адсталасці нашых кадраў, бо яна ў асноўным ужо ліквідавана, а ліквідацыя палітычнай бясклапатнасці і палітычнай даверлівасці да шкоднікаў, выпадкова атрымаўшых партыйны білет».

Каб рухацца ўпэўнена наперад, каб забяспечыць росквіт сіл нашай радзімы, мы павінны памятаць аб гэтых указаннях таварыша Сталіна, памятаць аб значэнні ідэйна-палітычнага выхавання ў наш час.

Калісьці пра перамогу немцаў ва франка-прускай вайне 70—71 гг. гаварылі, што ў гэтай перамозе рашаючую ролю адыграла школа, настаўнік. Сапраўды, у той перыяд Германія зрабіла нямала, каб падняць асвету ў сваёй краіне. І гэта, побач з другімі момантамі, адыграла вельмі буйную ролю ў перамозе немцаў над французамі. У нашай краіне за апошнія годы праведзена нябачаная па размерах і значэнню работа па ўзняццю культуры, па развіццю народнай асветы, па стварэнню кадраў высока-кваліфікаваных спецыялістаў. Наша краіна ўжо не тая, якой яна была ў першых баях супроць замежных інтэрвентаў у 1918—20 гг. і калі нават тады, поўразбураная вайной, культурна адсталая і зморапая краіна справілася з шырока арганізаваным знешнім нападам, то цяпер, калі матэрыяльны і культурны ўзровень народа значна ўзняўся, калі палітычна і маральна народы Совецкага Саюза небывала згуртованы пад нашым большэвіцкім сцягам, для поўнага поспеху нашай справы дастаткова таго, каб кожны грамадзянін Совецкага Саюза выканаў свой доўг, доўг чэснага сына свайго народа. **(Бурныя апладысменты).**

Як трэба разумець палітычныя задачы сучаснага моманту, аб гэтым нядаўна зноў напомніў таварыш Сталін у пісьме да комсамольца Іванова. Ён пісаў:

«Трэба ўвесь наш народ трымаць у стане мабілізацыйнай гатоўнасці перад тварам небяспекі ваеннага нападу, каб ніякая «выпадковасць» і ніякія фокусы нашых знешніх ворагаў не маглі засцігнуць нас знянацку...»

Каб выканаць гэту задачу, наша інтэлігенцыя, работнікі вышэйшай школы, студэнты і студэнткі павінны памятаць аб стаячай перад імі задачы: авалодаць ленінізмам, зрабіцца ў большэвіцкім сэнсе свядомымі ўдзельнікамі вялікай справы будаўніцтва соцыялізма. Вам, работнікам вышэйшай школы, дано перадавое месца не толькі ў радах культурных работнікаў, але і ва ўсіх галінах работы нашай дзяржавы. Вам многа дано, і таму вялікая ваша адказнасць перад народам. **(Апладысменты).**

Усёй вашай рабоце і рабоце кожнага з вас у паасобку забяспечана магутнае падтрыманне дзяржавы. Вы знойдзеце моцнае і высокае пачуццё задаволення ў сваёй рабоце, ідучы ўнагу са сваім народам, большэвікі сцяг якога высока развяваўся на нядаўніх выбарах у Вярхоўны Совет Саюза і зноў рэе ў вышыні на выбарах у Вярхоўныя Советы совецкіх рэспублік! **(Бурныя апладысменты, воклічы ў гонар правадыра народаў, любімага друга вучоных, студэнтаў, прафесараў і выкладчыкаў — таварыша Сталіна і ў гонар таварыша Молатава).**

Кандыдаты беларускага народа

(ПРАЦЯГ ІНФАРМАЦЫІ АБ АБ'ЯДНАНЫХ ПЕРАДВЫБАРЧЫХ СХОДАХ. ПАЧАТАК ГЛ. НА 1-ай СТАР.)

ПАЧАТАК ГЛ. НА 1-ай СТАР.

ПАСТАНОВА

АБ'ЯДНАНАГА ПЕРАДВЫБАРЧАГА СХОДА РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ І СЛУЖАЧЫХ ЗАВОДАУ І ФАБРЫК, БАЙЦОУ, КАМАНДЗІРАУ І ПАЛІТРАБОТНІКАУ Н-СКАЙ ЧАСЦІ МЕНСКАЙ ПРАМЫСЛОВАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад рабочых, работніц і працоўнай інтэлігенцыі, ад усіх выбаршчыкаў Менскай Прамысловай выбарчай акругі, — аб'яднаны перадвыбарчы сход рабочых, служачых, інжынерна-тэхнічных работнікаў машынабудаўнічага завода імя Варашылава, скурзавода «Большэвік», кандзіцерскай фабрыкі «Комунарка», швейнай фабрыкі імя Крупскай, завода «Чырвоная зара», Аўтарамонтнай станцыі, МГЭС-2, спірт-завода, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў № скай часці — усяго ў колькасці 8.000 чалавек пастанаўляе:

1. Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Менскай Прамысловай выбарчай акрузе ад рабочых, работніц і працоўнай інтэлігенцыі акругі вернага вучня і саратніка Владзіміра Ільіча Леніна, любімага правадыра народаў Совецкага Саюза, кіраўніка і арганізатара найвялікшых перамог соцыялізма, геніяльнага тварца самай дэмакратычнай у свеце Сталінскай Канстытуцыі, кіраўніка магутнай і грознай для ворагаў першай у свеце соцыялістычнай дзяржавы, заснавальніка совецкай дзяржаўнасці гераічнага беларускага народа — таварыша Сталіна Іосіфа Вісарыёнавіча, 1879 года нараджэння, члена ВКП(б), месца жыхарства — горад Масква, Крэмль.

2. Агульны сход у колькасці 8.000 чалавек просіць таварыша Сталіна даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі па Менскай Прамысловай выбарчай акрузе горада Менска ад рабочых, работніц і працоўнай інтэлігенцыі — выбаршчыкаў Менскай Прамысловай выбарчай акругі.

—o—

ПАСТАНОВА

АБ'ЯДНАНАГА ПЕРАДВЫБАРЧАГА СХОДА РАБОЧЫХ, РАБОТНІЦ, ІНЖЫНЕРАУ, ТЭХНІКАУ І СЛУЖАЧЫХ ФАБРЫКІ «КАСТРЫЧНІК», ЗАВОДАУ ІМЯ МЯСНІКОВА, «УДАРНІК», ШКЛОЗАВОДА «ПРОЛЕТАРЫЙ», МАЛОЧНАГА ЗАВОДА, ХІМФАРМЗАВОДА, ШЧОТАЧНАЙ ФАБРЫКІ, БАЙЦОУ, КАМАНДЗІРАУ І ПАЛІТРАБОТНІКАУ ДЗЕРЖЫНСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ ГОРАДА МЕНСКА

1. Абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых фабрыкі «Кастрычнік», заводаў імя Мяснікова, «Ударнік», шклозавода «Пролетарый», малочнага завода, хімфармзавода, шчотачнай фабрыкі і байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці, уваходзячых у Дзержынскую выбарчую акругу г. Менска, аб'яднаны перадвыбарчы сход у колькасці 7.000 чалавек аднадушна пастанаўляе:

1. Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Дзержынскай выбарчай акрузе горада Менска ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых прадпрыемстваў і байцоў, камандзіраў і палітработнікаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Дзержынскай выбарчай акругі горада Менска, кіраўніка совецкага ўрада, палкага барацьбіта за комунізм, бліжэйшага саратніка і друга вялікага Сталіна, любімага сына вялікага рускага народа — Вячэслава Міхайлавіча Молатава, 1890 года нараджэння, члена ВКП(б), месца жыхарства: гор. Масква, Крэмль.

2. Аб'яднаны перадвыбарчы сход у колькасці 7000 чалавек просіць таварыша Молатава Вячэслава Міхайлавіча даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі па Дзержынскай выбарчай акрузе горада Менска ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых прадпрыемстваў, байцоў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці, уваходзячых у Дзержынскую выбарчую акругу горада Менска.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Таварышу МОЛАТАВУ

Сабраўшыся на аб'яднаны перадвыбарчы сход у колькасці 7.000 чалавек, мы, рабочыя, работніцы, інжынеры, тэхнікі і служачыя прадпрыемстваў, чырвонаармейцы, камандзіры і палітработнікі Дзержынскай выбарчай акругі — шлем Вам, главе совецкага ўрада, саратніку і другу вялікага Сталіна, свае гарачае большэвіцкае прывітанне.

Аднадушным рашэннем вылучылі мы Вас кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР ад нашай выбарчай акругі і просім Вас даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Рэспублікі.

У Вашай асобе комуністычная партыя і совецкі народ маюць непахіснага і палкага барацьбіта за комунізм. Вы з'ўляецеся бліжэйшым і верным саратнікам таварыша Сталіна. Вы разам з Леніным і Сталіным вялі барацьбу супроць усялякіх ворагаў народа, супроць трацкісцка-бухарынскіх наймітаў фашызма, мацавалі магутнасць большэвіцкай партыі, яе адзінства, маральна-палітычнае адзінства совецкага народа вакол комуністычнай партыі, вакол вялікага Сталіна.

Гістарычныя перамогі соцыялізма ў нашай краіне, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі, цесна звязаны з Вашым імем і Вашай шматгадовай работай на пасту Старшыні Совета Народных Камісараў Саюза ССР.

Не пакладаючы рук, працуеце Вы над далейшым умацаваннем соцыялізма ў нашай краіне.

Беларускі народ да дня выбараў свайго соцыялістычнага парламента прыходзіць з найвялікшымі перамогамі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Магутнай і несакрушальнай сцяной стаіць Совецкая Беларусь на заходняй граніцы з капіталістычным светам, вораг не здолее пераступіць яе граніц.

Усімі гэтымі перамогамі беларускі народ абавязан нашай комуністычнай партыі, дарагому другу беларускага народа таварышу Сталіну і Вам, як главе совецкага ўрада.

Дарэмны былі старанні ворагаў народа, тройчы прэзрэнных наймітаў фашызма, трацкісцка-бухарынскіх і нацыянал-фашысцкіх бандытаў, якія прабавалі шкодніцтвам, дыверсіяй аслабіць нашу рэспубліку, адарваць яе ад іншых совецкіх рэспублік і аднавіць у ёй ярмо капіталізма. Своечасовая дапамога вялікага Сталіна, дапамога Саюзнага ўрада і асабіста Ваша, таварыш Молатаў, расстроіла каварныя планы ворагаў. Слаўная совецкая разведка, кіруемая сталінскім наркомам тав. Нікалаем Іванавічам Ежовым, нанесла сакрушальны ўдар ворагу. Варожыя гнёзды разгромлены. Вынікі шкодніцтва з Вашай дапамогай быстра і энергічна ліквідуюцца. Ніякія проіскі ворагаў не адарвуць Совецкую Беларусь ад брацкіх совецкіх рэспублік. Саюз Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік — такая крэпасць, аб якую зломіць зубы і галаву любы і ў любой колькасці вораг.

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч! Мы з радасцю і захапленнем усе, як адзін, аддадзім за Вас свае галасы. Выбранне Вас дэпутатам Вярхоўнага Совета БССР яшчэ больш умацуе нашу Беларускую рэспубліку, яшчэ больш моцнымі і цеснымі ўзамі злучыць рускі і беларускі народы, а таксама ўсе народы Совецкага Саюза.

Дарагі Вячэслаў Міхайлавіч! Звяртаючыся да Вас з просьбай даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Дзержынскай выбарчай акрузе, мы выказваем гэтым волю і жаданне ўсяго беларускага народа.

Беларускі народ ганарыцца вялікім сынам вялікага рускага народа Вячэславам Міхайлавічам Молатавым і будзе шчаслівы ў дзень выбараў — 26 чэрвеня — аддаць за яго свае галасы.

Мы чакаем ад Вас, дарагі Вячэслаў Міхайлавіч, станоўчага адказу на наш зварот.

Няхай жыве магутны непераможны блок комуністаў і беспартыйных!

Няхай жыве Сталінскі Цэнтральны Камітэт нашай партыі!

Няхай жыве вялікі сын вялікага рускага народа Вячэслаў Міхайлавіч Молатаў!

—o—

ПАСТАНОВА

ПЕРАДВЫБАРЧАГА СХОДА МОЛАТАУСКАЙ ВЫБАРЧАЙ АКРУГІ

Абмеркаваўшы пытанне аб вылучэнні кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імя Молатава, трамвайнага парка, друкарні імя Сталіна, завода ланцугоў Галля, Белпромпраекту, ад настаўнікаў, навуковых работнікаў, студэнцтва і служачых Політэхнічнага інстытута, Палітасветшколы і Аўтадарожнага тэхнікума, ад урачоў, медыцынскіх работнікаў і служачых Клінічнага гарадка, ад чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці БВА — агульны сход у колькасці 10.000 чалавек пастанаўляе:

1. Вылучыць кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета Беларускай Совецкай Соцыялістычнай Рэспублікі па Менскай Молатаўскай выбарчай акрузе ад рабочых і работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імя Молатава, трамвайнага парка, друкарні імя Сталіна, завода ланцугоў Галля, Белпромпраекту, ад выкладчыкаў, навуковых работнікаў, студэнтаў і служачых Політэхнічнага інстытута, Палітасветшколы і Аўтадарожнага тэхнікума, ад урачоў, медыцынскіх работнікаў і служачых Клінічнага гарадка, ад чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці БВА — вернага вучня вялікага Леніна, бліжэйшага саратніка і друга вялікага Сталіна, жалезнага наркома абароны Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік, стойкага, выпрабаванага барацьбіта з ворагамі народа, барацьбіта за ажыццяўленне бяссмертных ленінскіх ідэй, за справу комунізма — першага маршала Совецкага Саюза, дэпутата Вярхоўнага Совета Саюза ССР таварыша Клімента Ефрэмавіча ВАРАШЫЛАВА, 1881 г. нараджэння, члена ВКП(б); месца жыхарства: г. Масква, Крэмль.

2. Аб'яднаны сход просіць таварыша Клімента Ефрэмавіча ВАРАШЫЛАВА даць сваю згоду балатыравацца ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па Менскай Молатаўскай выбарчай акрузе ад рабочых, работніц, інжынераў, тэхнікаў і служачых завода імя Молатава, трамвайнага парка, друкарні імя Сталіна, завода ланцугоў Галля, Белпромпраекту, ад выкладчыкаў, навуковых работнікаў, студэнтаў і служачых Політэхнічнага інстытута, ад урачоў, медыцынскіх работнікаў і служачых Клінічнага гарадка, ад чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў Н-скай часці БВА.

3. Паслаць пісьмо тав. Кліменту Ефрэмавічу Варашылаву.

4. Паслаць прывітальную тэлеграму правадыру народаў, нашаму другу і настаўніку Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну.

МАСКВА, КРЭМЛЬ

Наркому Абароны СССР тав. ВАРАШЫЛАВУ

Дарагі Клімент Ефрэмавіч!

Перадвыбарчы сход рабочых і работніц, чырвонаармейцаў і камандзіраў, палітработнікаў і студэнтаў, навуковых работнікаў і служачых прадпрыемстваў і ўстаноў Молатаўскай выбарчай акругі горада Менска шле Вам, выдатнаму палкаводцу соцыялістычнай радзімы, любімаму маршалу Совецкага Саюза, свае палкае большэвіцкае прывітанне.

Мы вылучаем у дэпутаты Вярхоўнага Совета Совецкай Беларусі Вас, Клімент Ефрэмавіч — вернага саратніка вялікага Сталіна, загартованага ў баях з ворагамі народа, у ажыццяўленні бяссмертных ленінскіх ідэй, ідэй комунізма. Мы просім Вас, Клімент Ефрэмавіч, даць сваю згоду балатыравацца ў Молатаўскай выбарчай акрузе горада Менска.

Мы, рабочыя і работніцы, камандзіры і чырвонаармейцы, палітработнікі і студэнты, навуковыя работнікі і служачыя, з вялікай радасцю ўсе, як адзін, аддадзім свае галасы за Вас, Клімент Ефрэмавіч, лепшага прадстаўніка блока комуністаў і беспартыйных.

Няхай памятаюць ворагі, што беларускі народ, як і ўсе народы нашага магутнага Совецкага Саюза, разам з сваёй доблеснай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміяй пад Вашым, Клімент Ефрэмавіч, кіраўніцтвам зорка ахоўваюць сваю соцыялістычную радзіму.

Мы будзем яшчэ больш мацаваць нашу квітнеючую Беларускую Совецкую Соцыялістычную Рэспубліку — магутны фарпост Совецкага Саюза на заходніх рубяжах. Будзем яшчэ больш пільнымі і да канца выкарчуем і сатром з твару совецкай зямлі астаткі трацкісцка-бухарынскай і буржуазна-нацыяналістычнай фашысцкай нечысці.

Няхай жыве наш вялікі правадыр і настаўнік Іосіф Вісарыёнавіч Сталін!

Няхай жыве верны саратнік вялікага Сталіна — палкаводзец непераможнай Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі — Клімент Ефрэмавіч Варашылаў!

АНРЫ БАРБЮС

У верасні бягучага года споўніцца тры годы з дня смерці выдатнага французскага пісьменніка Анры Барбюса. Ён памёр у Маскве, у сталіцы Совецкага Саюза, куды ён прыехаў не як госць, а як сын пролетарскай бацькаўшчыны.

Найвялікшы правадыр народаў таварыш Сталін у сваіх мужных словах, прысвечаных памяці Барбюса, выказаў глыбокую пашану ўсяго совецкага народа да выдатнага пісьменніка і чалавека, да яго вялікай спадчыны, пакінутай чалавецтву:

«Няхай яго жыццё, яго барацьба, яго надзеі і перспектывы паслужаць прыкладам для маладога пакалення працоўных усіх краін у справе барацьбы за вызваленне чалавецтва ад капіталістычнага рабства».

Сусветная слава Барбюса пачалася з рамана «У агні», пасля гэтай кнігі, поўнай прароцкага гневу, з вялікай сілай прагучаўшай над залітымі крывёю палямі Еўропы 1916 года, кнігі, якая не толькі бязлітасна выкрывала вайну, але і паказвала масам выхад з яе.

На фоне шавіністычнай і ўра-патрыятычнай віскатні і выкрыкаў буржуазнай літаратуры раман «У агні» прагучаў як рэвалюцыйны заклік супроць самых устояў капіталістычнага грамадства. Барбюс стаў на чале рэвалюцыйнага руху заходне-еўрапейскай інтэлігенцыі супроць вайны.

В. І. Ленін першым ацаніў рэвалюцыянізіруючую ролю рамана.

«Адным з асабліва наглядных сцвярджэнняў усюды назіраемай масавай з'явы росту рэвалюцыйнай свядомасці ў масах, — пісаў Ленін,—можна прызнаць раманы Анры Барбюса «У агні» і «Яснасць».

Уступіўшы на рэвалюцыйны шлях, Барбюс ужо ніколі не пакідаў яго. Ён арганізаваў у 1919 годзе грамадска-літаратурную групу «Кляртэ», у праграме якой значылася рашучае асуджэнне ўсёй капіталістычнай культуры і спачуванне комунізму. Барбюс, ідучы па рэвалюцыйнаму шляху, нарэшце, афіцыйна ўвайшоў у рады комуністычнай партыі.

Заняты велізарнай грамадска-палітычнай работай, ён не пакідае, аднак, і сваёй літаратурнай дзейнасці. У 1924 годзе ён стварае грандыёзны па замыслу раман «Звенні», у якім па гістарычных эпохах, пачынаючы ад Вавілона, Егіпта, Грэцыі і Рыма, прасачыў праблему сацыяльнай няроўнасці. Гэтая кніга далёкая ад спакойнай сузіральнай роўнадушнасці. Звернутая да аддаленых эпох чалавечай гісторыі, яна не менш сучасная, чым кніга «Каты» (1925 год), у якой паказваюцца жахі белага тэрору на Балканах. Кожны радок гэтай дышачай гневам кнігі кліча да барацьбы.

У 1932 годзе паявілася кніга Барбюса пра Золя. У ёй дадзена не толькі глыбокая характарыстыка буйнейшага рэалістычнага мастака, але і пастаўлена пытанне пра лёс мастацтва пры капіталізме. Ад рэалістычнага метада Золя і яго трагічнай адзіноты Барбюс праводзіць простую лінію да сучасных задач.

Увабраўшы ў сябе лепшае, што было і ёсць у сусветнай культуры, Барбюс адным з першых зразумеў смерценоснасць фашызма для сусветнай культуры, і таму так энергічна, палка і нястомна змагаўся з фашызмам.

У гэтай барацьбе ён чэрпаў свае сілы. Не было ні аднаго антыфашысцкага кангрэса, з'езда, мітынга, схода, дэманстрацыі, у якіх Барбюс не адыгрываў бы кіруючай аўтарытэтнай ролі. Усім памятна яго гарачая прамова на Амстэрдамскім кангрэсе, усе ведаюць, яго ролю ў кампаніях па барацьбе за вызваленне таварышаў Дзімітрава, Тэльмана і Ракошы.

Барбюс уважліва вывучаў соцыялістычнае будаўніцтва ў СССР. Вызваленне чалавецтва, соцыялістычная рэвалюцыя, Совецкі Саюз для яго былі нераздзельнымі сінонімамі. Ён сапраўды быў другам Совецкага Саюза з першых дзён соцыялістычнай рэвалюцыі і да апошніх дзён свайго жыцця.

Апошнія годы жыцця Барбюса былі гадамі выключна напружанай творчай працы. Ён прыступае да ажыццяўлення сваіх даўных літаратурных замыслаў. Піша кнігу аб Сталіне, працуе над кнігай аб Леніне, работа над якой спынена яго заўчаснай смерцю.

Буйны твор Барбюса «Сталін» навеян вобразам вялікага правадыра сусветнага пролетарыята, геніяльнага кормчага соцыялістычнай рэвалюцыі, перад якім Барбюс прыкланяўся і ў якім ён справядліва бачыў вызваліцеля чалавецтва.

Верны друг Совецкага Саюза, Барбюс любіў лепшай любоўю, якая толькі магчыма, працоўных Краіны Советаў, і працоўныя Совецкага Саюза адказвалі Барбюсу той-жа любоўю, той-жа дружбай.

ВЯЛІКІ ПЕСНЯР СОВЕЦКАГА НАРОДА

Казахстан, Алма-Ата

НАРОДНАМУ ПАЭТУ, ОРДЭНАНОСЦУ ДЖАМБУЛУ

Вам, батыр совецкай паэзіі, мудры песняр нашай радзімы, мы — пісьменнікі Совецкай Беларусі, сабраўшыся на свой пленум, шлем сваё сардэчнае, гарачае прывітанне!

Вашы песні, што звіняць чысцей ад срэбра, вашы песні, высокія як неба, дышаць маладосцю, свежасцю і натхняюць нас на напісанне новых твораў пра наша прыгожае жыццё, пра нашага вялікага правадыра, роднага таварыша Сталіна.

Семдзесят пяць год складаеце Вы свае песні:

Джамбулу девяносто лет...
Я пел всю жизнь. Я стар и сед.
Но стал на старости кедей
Счастливей всех людей.

Вы атрымалі шчасце, аб якім марылі і снілі народы, марылі багатыры, такія, як багыр Утэген у Вашай цудоўнай легендзе.

Гэтае шчасце дала народам наша слаўная партыя Леніна—Сталіна:

Казахи в степях,
Грузины в горах,
Зыряне в лесах,
Белоруссы в полях —
Народы, чтоб каждое слово сберечь,
Слушают Сталина речь.

Вялікай, дружнай шматнацыянальнай сям'ёй жывуць народы Совецкага Саюза. Самыя прыгожыя і шчаслівыя песні звіняць на зямлі, імя якой — СССР.

Вашы песні, дарагі таварыш Джамбул, магутныя таму, што Вы аддаеце ўсю цудоўную сілу паэта на шчасце і славу вялікага совецкага народа, ад імя якога вы гаворыце:

— Калі я спяваў аб народзе, я спяваў аб сабе. Калі-ж я спяваў аб сабе, я адначасова спяваў аб народзе.

Вашы песні магутныя таму, што яны смела клічуць змагацца з ворагамі народа. Ваша выдатная паэма пра любімага наркома Ежова — лепшае, што напісана пра мужнага чалавека, кіраўніка слаўнай совецкай разведкі, якая выкрывае ворагаў, пад якой-бы маскай яны ні хаваліся.

Аскер с винтовкой ходит в бой,
Джамбул с любимою домброй...
Я песней из каленых слов
Пойду разить врагов.

Вітанне табе, Джамбул, ад беларускіх лясоў, азёр і рэк! Вітанне табе, Джамбул, ад беларускіх спелых ніў, ад фабрык і заводаў!

Вітанне табе, казахскі народ, і твайму найлепшаму песняру ад беларускага народа з заходніх граніц Совецкага Саюза!

Дарагі Джамбул, беларускія совецкія паэты і пісьменнікі жадаюць табе яшчэ доўга-доўга жыць і спяваць на радасць усім прапоўным!

Як сонечны чароўны цвет,
Расцвіў твой дзіўны дар.
Мы шчыры шлём табе прывет,
Шчаслівых дзён песняр!

Няхай жыве вялікая партыя Леніна—Сталіна, пад мудрым кіраўніцтвам якой растуць і квітнеюць магутныя народныя таленты!

Няхай жыве вялікі правадыр народаў таварыш Сталін!

ПЛЕНУМ ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР.

Тав. Джамбулу!

Саюз совецкіх пісьменнікаў Беларусі вітае Вас, масцітага песняра казахскага народа, аднаго з старэйшых і лепшых паэтаў Совецкага Саюза. У Вашай асобе мы вітаем вялікі казахскі народ, які гераічна змагаўся супроць рускага царызма і ўласнага байства, вырваўшы ў іх пад кіраўніцтвам ленінскай партыі большэвікоў і рускага рабочага класа ўладу і стварыўшы новае шчаслівае жыццё. Вашы песні, прысвечаныя гэтай барацьбе, прысвечаныя партыі і геніяльнаму кіраўніку яе — Іосіфу Вісарыёнавічу Сталіну, роўна блізкія і дарагія кожнаму прапоўнаму СССР. І ў нас, у Беларусі, іх ведаюць, чытаюць, любяць і любяць Вас, мудры баян братняга народа. Совецкая ўлада і партыя далі Вам 170-мільённую аудыторыю, і ўся яна заслухоўваецца глыбокай, ззяючай горнымі самацветамі паэзіяй Джамбула. Мы вучымся ў Вас і жадаем Вам яшчэ доўгія, доўгія годы тварыць на славу нашай вялікай радзімы і яе шматнацыянальнага, але адзінага совецкага народа.

Янка КУПАЛА. Якуб КОЛАС. Міхась ЛЫНЬКОЎ, Пятрусь БРОЎКА, Кузьма ЧОРНЫ. Змітрок БЯДУЛЯ, Кандрат КРАПІВА. Пятро ГЛЕБКА, Іван ШАПАВАЛАЎ, Міхась КЛІМКОВІЧ, Ілья ГУРСКІ.

ДЖАМБУЛУ

З прычыны хваробы не магу асабіста прысутнічаць і абняць Вас, вялікага народнага акына, геніяльнага песняра казахскага народа.

Захоплены Вашай цудоўнай паэзіяй, выказваю Вам сваю братнюю любоў і жадаю доўгіх гадоў жыцця і творчасці на карысць совецкага народа, на карысць вялікай комуністычнай партыі і яе мудрага правадыра таварыша Сталіна.

Няхай і ў далейшым пераможна грыміць над нашай краінай — ад граніц Беларусі да далёкаўсходніх граніц — магутная песня вялікага акына Джамбула.

Янка КУПАЛА.

УКАЗ

ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ТАВ. ДЖАМБУЛА ДЖАБАЕВА ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

У сувязі з 75-гадовай творчай дзейнасцю, узнагародзіць народнага песняра Казахстана таварыша **Джамбула Джабаева** ордэнам Леніна.

Старшыня прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР **М. КАЛІНІН.**
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР **А. ГОРКІН.**

Масква, Крэмль. 19 мая 1938 года.

ДЖАМБУЛУ

Джамбулу я песню сягоння пяю,
Пад сэрца і думу настроіў сваю:
Ляці, мая песня, ляці і спявай,
Суседа акына, як след, прывітай!
Джамбул, калі песню пускае ў палёт,—
Аб Сталіне песню ў мільённы народ,—
Ад сонцаў усходніх, у сонп агніве,
Да сонцаў заходніх, бы ў вырай
плыве.
Джамбул, шызакрылы сталетні арол,
Бурліцца крынічна жыццё навакол, —
Ці гром, ці маланка, ці грозны пяруи,
Стаіш непахісна, дзён светлых вяснун.
Джамбул-песнятворац, казахскі акын,
Народу казахскага сонечны сын,
Спявай, казахстанскіх стэпоў салавей,
Чаруючых песень і дум чарадзей!
Джамбуле, баяне совецкіх часін,
Калі песню кінеш з казахскіх далін,—
Ляціць гэта песня па нашай зямлі
І водгук знаходзіць у самым Крэмлі.
Джамбуле, баяне, хоць стар на гады,
А сэрцам, а песняй заўжды малады.
На сталінскіх крыллях ляціць песня
ў свет,
А сонца да шчасця цярэбіць ёй след.
Джамбуле, баяне, шчаслівы акын
Сягочасных сталінскіх цудаў, былін,—
Праз горы і долы, палі і лясы
Лятуць тваіх песень да нас галасы.
Джамбуле, баяне, магутны твой сказ,
Аб дружбе народаў пяяў ты не раз;
Казах, беларус—пяюць песні адны,
Радзімы адной арляняты-сыны.
Джамбулава песня—ад ясных крыніц,
Джамбулава песня не знае граніц.
Не знаюць граніцаў пад небам арлы,
Лунаюць па светах скрозь ветры
скрозь мглы.
Джамбуле, у госці да нас прыляці,
Пабудзь хоць хвіліну ў нашым
жыцці.
Цябе прывітаюць шум сосен, бяроз,
І кветкі-вяснянкі брыллянтамі рос.
Джамбулу я песню сягоння пяю,
Пад сэрца і думу настроіў сваю:
Ляці, мая песня, ляці і спявай,
Суседа акына, як след, прывітай!

ЯНКА КУПАЛА.

14 мая, 1938.

ДЖАМБУЛУ

Ад снежных вяршалін Каўказа, Паміра,
Як гордасць шчаслівых аулаў,
Грыміць многаструнная звонкая ліра,
Сімфонія песень Джамбула.

Дзівосныя песні яго—зараніцы,
Што ззяюць у яснай лазуры,
Што сыплюць вясёлкі, святло бліскавіцы,
Сатканыя з сонца і буры.

У іх дыша свежасць, юначая сіла,
І мудрасць у іх Казахстана,
Імклівасць патокаў, арліныя крылы
Чаруючых думак баяна.

Плывуць яго песні ад краю да краю
Натхнёна, свабодна, прачула
Дзядулю Джамбула я шчыра вітаю,
Вітаю акына Джамбула.

Вітаю і партыю, Сталіна геній,
Што круг наш глухі разамкнулі,
Што сеюць народам для дружбы праменні,
Што нам падарылі Джамбула.

Якуб КОЛАС.



ДЖАМБУЛ ДЖАБАЕЎ.

Джамбул

ВЯЛІКІ СТАЛІНСКІ ЗАКОН

Песня мая, ты ляці па аулах,
Слухайце, стэпы, акына Джамбула!
Многа ў жыцці я законаў знаў,
Ад гэтых законаў гарбатым стаў,
Ад гэтых законаў слёзы цяклі,
Глыбокія зморшчкі на лбу залеглі,
Законы Аллаха, законы Аблая,
Законы крывавага Нікалая.
Па гэтых законах дзяцей адбіралі,
Па гэтых законах людзей забівалі,
Нашых дзяўчат, як жывёл, прадавалі.
Па гэтых законах аулы пусцелі,
Па гэтых законах баі тлусцелі
І моцна на шыі народа сядзелі.
Па гэтых законах гулялі, як смерч,
Бяспраўе і голад, і смерць.
Песня мая, ты ляці па аулах,
Слухайце, стэпы, акына Джамбула!
След маленькі — дарогу стварае,
Глыбокае мора — з крыніц вырастае,
З камня — пругкая сталь выходзіць,
З слоў—нараджаецца мудрасць
ў народзе.
Ад шчасця ў жыцці—
нараджаюцца дзеці,
Самыя радасныя на свеце!
Спяваюцца песні з цвіценнем дзяцей
Усіх песень чароўней і прыгажэй!
Звіні-ж, дамбра, па калгасных аулах,
Слухайце, стэпы, акына Джамбула!
Слухай Кастэк, Каскелен, Каракон,
Я слаўлю Вялікі Совецкі Закон.
Закон, па катораму радасць
прыходзіць,
Закон, па катораму стэп
пладародзіць,
Закон, па катораму сэрца спявае
І юнасць шчаслівая расцвітае,
Закон, па катораму служыць
прырода
На славу і гонар працоўным народам,
Закон, па катораму вольным джыгітам
К подвігам смелым дарога адкрыта,
Закон, па катораму ў свята па-праву
Куляш высокай завеяна славай.
Закон, па катораму едуць вучыцца
Дзеці аульныя ў школы сталіцы.
Закон, па катораму ўсе адзіны
І роўны ў сузор'і рэспублік краіны!
Спявайце, акыны, хай песні
паллюцца!
Спявайце аб Сталінскай Канстытуцыі!
З песняй, акыны, ідзіце на сходы,
З песняй пра брацтва вялікіх
народаў,
З песняй краіны квітнеючай працы,
З песняй, што кліча тварыць
і змагацца.
Сагрэты увагай народы радзімы
Мудрым Сталіным—бацькам любімым!

Пераклад А. УШАКОВА.

ПЕСНЯ СОНЦУ

Звіні першамайскаю песняй, зямля!
Ляці, першамайская песня мая!
Жыцця маладосць, нібы сонца, ўстае,
Багацця дыван рассцілае зямля!

Народ мой з нор векавых і бярлог,
З вечных магіл, з халодных бярлог,
Выйшаў за Леніным у Кастрычніку
На самую сонечную з дарог.

Цвіці, радзімы лікуючы сад,
Ляці, салавей, у мой радасны сад.
Песню аб юнасці, як салавей,
Спявай, хто душою і сэрцам багат!

Выйшаў і вырас, як горны чынар,
Красун Усходу, магутны чынар —
Народ, гаспадар багатай зямлі,
Стэпаў і гарадоў гаспадар.

Дрэвы ў глыбокіх пяснінах растуць,
Жамчужныя рэкі ў далінах бягуць,
А гордыя горы над Алма-Ата,
Як слава і сіла народа, ўстаюць.

Стэп, прачынаючыся ад сна,
Праклятых стагоддзяў цяжкога сна,
Юнасці дар аддае старым
І вечную юнасць вітае вясна,

Багат урачысты наш кветкамі май,
Запальвае сэрцы агнёвы май,
Страчае, як шчасце, стары й малады
Пад сталінскім сонцам чароўны май.

Цвіці, радзімы лікуючы сад,
Ляці, салавей, у мой радасны сад.
Песню пра радасць, як салавей,
Спявай, хто душою і сэрцам багат!

Сонца, ты шчасце ўсюды раздай,
Песні і нашу цяплынь разлівай.
Праменнем гарачым ірві рубяжы,
Няхай скрозь праходзіць наш
сонечны май.

Сонца, скажы, што душою Джамбул
У Кіргізіі, там дзе пяе Алымкул,
І ў Грузіі сонечнай, і ў Кабардзе,
І там, дзе Мадрыд, як батырскі аул!

Цвіці, радзімы лікуючы сад,
Ляці, салавей, у мой радасны сад.
Песню аб радасці, як салавей,
Спявай, хто душою і сэрцам багат!

О, сонца, ты песню Джамбула разлі,
Ты песню вялікіх народаў разлі,
Усюды, дзе майскага свята чакаюць,
Усюды, дзе людзі жывуць на зямлі!

Хай шчасце ззяе і радасць гарыць,
Хай перамога над светам ляціць,
Хай з нашаю песняй земная куля
Голасам радасці прагрыміць.

Ты, сонца! Гарачыя ўсмешкі твае!
Ты, сонца! Шчодры дары твае!
Ты ханам, царам і ўладарцам зямлі
Ліло роўнадушна праменні свае.

Ды Сталін душой, што цябе гарачэй,
Праменняў тваіх жыццёдарных
цяплей,
Прымусіў цябе для народа паляць
Кастром, што запальвае душы
людзей.

Цвіці, радзімы лікуючы сад,
Ляці, салавей, у мой радасны сад.
Песню аб юнасці, як салавей,
Спявай, хто душою і сэрцам багат!

О, сонца! Ці ведала ў свеце закон?
Ты, сонца, ці бачыла ў свеце закон?
Святлей цябе і цяплей цябе
Сталіна мудры закон!

Мая Канстытуцыя — гэта плады
Мараў стагодніх, як сноў залатых.
Сонца, як шчасця жывая крыніца,
Мая Канстытуцыя, Сталін і ты!

Пераклад А. УШАКОВА.

Мікола Хведаровіч

БАГАЦЕЙШАЯ КРЫНІЦА НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

Совецкая літаратура адзначае 75-гадовы юбілей літаратурнай дзейнасці народнага песняра Казахстана — Джамбула. Уся совецкая грамадскасць, шматмільённы чытач нашага Совецкага Саюза добра ведае і захапляецца цудоўнай паэтычнай творчасцю 92-гадовага волата народнай паэзіі.

Амаль векавую творчасць Джамбула, поўна, нельга ўкласці ні ў якія томы. Усё жыццё яго было песняй, якая выяўляла боль і пакуты, гора і радасць свайго народа.

Пад дзікую песню стэповай пургі нарадзіўся Джамбул зімой 1846 года ў сям'і качэўніка Джабая, у часе яго зімовай вандроўкі па стэпах Казахстана, ля падножжа двух гор — Хан і Джамбул. Па стэповаму звычаю, вакол нованароджанага сабраліся песняры і дамбрысты, сярод іх брат Джабая-вядомы ў стэпах песняр. Песняры ў сваіх песнях прарочылі дзіцяці шчаслівы лёс. Яны параўноўвалі яго з вяршынямі гор, ля падножжа якіх нарадзіўся ён. Усхваляваны бацька даў свайму сыну імя Джамбул — імя высокай гары.

Вось кароткія аўтабіяграфічныя весткі аб магутным казахскім паэце. Абкрадзены ханамі, баямі і купцамі, бедны Джабай, бацька Джамбула, прадоўжваў свой гаротны вандроўны лёс качэўніка па неабдымных казахскіх стэпах. Голад і смерць усюды, на кожным кроку падпільноўвалі сям'ю Джамбула. Малое дзіця з заміраннем сэрца слухала страшную песню стэповай пургі. Але вечаровымі часамі, калі загараліся каля юртаў вогнішчы і дамбрысты, сабраўшыся ў круг усё качэўе, распявалі свае песні, вочы Джамбула блішчалі ад захаплення, як зоркі ў сінім небе. Джамбул усім сэрцам слухаў родныя напевы пра гора казахскага бяспраўнага народа, пра тоўстых мул, пра страшных грабаўнікоў — ханаў, пра вольных правадыроў казахскага народа, славутых батыраў.

Калі стойбішча засынала, Джамбул ціхком увайшоўшы ў юрту, браў дамбру свайго дзядзькі і бег у стэп. І там, у шырокім і ціхім стэпу, пад шум пахучага кавыля, ён складаў першыя свае песні і завучваў іх напамяць.

Вось што гаворыць Джамбул, успамінаючы дні свайго маленства:

«Калі дамбра трапіла мне ў рукі, гукі яе перавярнулі маю душу. Мне здалося, што звініць не дамбра, а маё маладое сэрца. І калі я ўцякаў у стэп і гучна пяяў, мне здавалася, што ўвесь стэп запаўняўся маім голасам».

Ужо чатырнаццацігадовым хлапчуком Джамбул пачынае самастойна спяваць. З сваёй неразлучнай сяброўкай дамброй ён ходзіць ад стойбішча да стойбішча і на ўвесь шырокі стэп спявае свае песні. За гэтыя песні карміл і паілі жывячым кумысам казахі свайго маладога песняра. Калі было Джамбулу пятнаццаць год, ён пачуў аб славе вядомага акына Сююмбая і вырашыў абавязкова пабачыцца з ім і паслухаць яго песні. Знясілены вялікай дарогай, ён ледзь не загінуў. Дайшоўшы да юрты Сююмбая, ён сабраў апошнія сілы і заспяваў. Сююмбай выйшаў з юрты, падняў хлапчука, напаіў кумысам. З гэтага часу Джамбул стаў вучнем Сююмбая, і гэта сустрэча назаўсёды вырашыла лёс Джамбула.

Дастойны вучань пераняў усё вялікае майстэрства магутнага акына. Загарэлыя пальцы ўпэўнена перабіралі звонкія струны дамбры.

Так пачынаецца самастойнае жыццё вялікага песняра шырокіх казахскіх стэпаў.

«Я быў бедняком і добра разумеў бедны народ, — кажа Джамбул, — праўдзіва я мог пяяць толькі аб сабе і народзе. Калі я спяваў аб народзе, я спяваў аб сабе. Калі-ж я спяваў аб сабе, я адначасова спяваў аб народзе. Я зразумеў усім сэрцам, што акыну нельга фальшывіць і крывадушнічаць, стаў спяваць сваім голасам, і толькі праўда і мае песні паляцелі па ўсім Джэтысу, як вольныя птахі».

Народ надаў вялікую сілу джамбулавай паэзіі. Народ быў невычэрпнай крыніцай мудрай напеўнасці Джамбула. Народ, бедны, працоўны і абрабаваны ханамі і муламі, у хвіліны сваёй радасці і гора клікаў Джамбула да сябе ў юрту і піў пахучы стэповы арамат яго мудрай песні. Гэтая песня аблятала бяскрайныя стэпы Казахстана, мінаючы пяскі самумаў, спёку гарачай пустыні і даходзіла да самых глыбінь вялікага сэрца народа.

Чым мог абрабаваны, галодны народ падтрымаць свайго песняра? Увагай, вялікай увагай, цёплым словам і ласкай. Годы вандроўкі, голаду і холаду, стэповага цяжкога жыцця наклалі глыбокія сляды на душу Джамбула. Ён бачыў бедны, абрабаваны, цёмны свой народ без радзімы, без імені, прыдушаным царскімі жандарамі. «У 55 год, — успамінае Джамбул, — мне стала пагана. Ад старасці і цяжкіх умоў жыцця я стаў сутогбы, як стары беркут. Вочы мае патухлі, а голас аслабнуў. Уладары стэпаў глушылі мае заветныя песні, ірвалі з грудзей маё сэрца, я патухаў, не меў сілы спяваць. Шырокі стэп мне замяніла вузкая пасцель».

Так прыходзіць смерць. Роспач і безнадзейнасць глушаць дзівосны голас казахскага салаўя. І не вытрымаў-бы Джамбул гора свайго народа і сваёй краіны, калі-б не развеяліся хмары і ленінскае сонца не ўзышло над Казахстанам. Вялікая праўда Леніна—Сталіна ўзышла над стэпамі ў ззянні Кастрычніцкай рэволюцыі. Яна вярнула страчаны голас песняру, аднавіла яго сілы. Сэрца стала зноў мацней біцца ў грудзях, песня стала маладою і шпаркакрылай. Джамбул зноў бярэ ў рукі паслушную спадарожніцу-дамбру і рухавыя пальцы абудзілі і ўстрывожылі пявучыя струны. Джамбул пяе аб слаўных батырах рэволюцыі — Леніне і Сталіне, аб палкаводцу Чырвонай Арміі Клімение Варашылаве.

Вожди человечества Ленин и Сталин
На штурмы вели и к восстанию звали.
Был клич их к народу могуч и грозов,
И Клим Ворошилов услышал их зов.

Стары Джамбул усю сілу свайго таленту аддае на змаганне за ўстанаўленне совецкага ладу ў Казахстане, на барацьбу з царскімі генераламі і басмачамі. Яго песні заклікаюць і натхняюць джыгітаў, усе акыны стэпаў прыслухоўваюцца да гучнай песні Джамбула. Яна, як зазыўны звон, узнімае казахскі народ на барацьбу і перамогу.

Так прыходзіць сапраўднае нараджэнне, так стары 70-гадовы Джамбул становіцца маладым у маладым сонечным Казахстане.

Песні вялікага акына Джамбула вызначаюцца ў нашай совецкай паэзіі сапраўднай народнасцю. Векавы Джамбул сабраў у сваім сэрцы думы і жаданні працоўнага народа, яго вялікую і непадражальную мудрасць. У сваіх дзівосных песнях аб нашай радзіме, аб таварышу Сталіну песняр выказвае вялікую народную любоў да свайго правадыра, які даў шчаслівае жыццё раней рабска прыгнечанаму і бяспраўнаму казахскаму народу:

Сталин! Солнце весенее—это ты!
Ты посмотришь, и, словно от теплых
лучей,
Колосятся поля, расцветают цветы,
Сердце бьется сильнее и кровь
горячей.

Джамбул шукае самыя лепшыя словы, каб апяяць вялікі геній правадыра. Сталіна не параўнаеш ні з чым. Сталін—гэта велізарная радасць і магутнасць, шчасце і доля ўсяго працоўнага чалавецтва.

Он разумом выше Памира и звезд,
И к людям внимателен, ласков и
прост.
Он мощью своей превосходит Арал,
И каждый бедняк в нем отца увидал.
Как солнце он ясен, высок и могуч,
И греет народы теплом его луч.
Он как океан необ'ятно велик,
Обидно Джамбулу, что беден язык.
Слов не хватает, чтоб так прозвенеть,
Чтоб сталинский гений достойно
воспеть...

У песнях аб вялікім совецкім народзе самымі цёплымі лірычнымі словамі перадаецца вялікая любоў усяго совецкага народа да слаўных саратнікаў правадыра, якія вядуць нашу краіну да шчасця і радаснага жыцця:

Товарищ Молотов! Дар прими —
Простые народные песни мои.
В сердце я имя твое сохранил,
Великого Ленина ученик,
Великого Сталина верный друг...

Вобраз любімых людзей, слаўных палкаводцаў Чырвонай Арміі гучыць амаль у кожнай песні Джамбула. Нечаканыя абароты паэтычнай мовы ў скупых кароткіх словах выражаюць глыбокі філасофскі змест. Вось кароткія радкі пра слаўнага маршала Клімента Варашылава:

Судьба Ворошилова — наша судьба,
Борьба Ворошилова — наша борьба.

92-гадовы дзядуля Джамбул добра ведае гісторыю свайго народа. Складаючы свае песні пра Клімента Варашылава, ён параўноўвае яго з самымі адважнымі батырамі Казахстана:

У Клима отвага и воля крутая,
И львиная сила, как у Исатая.
И дум чистота, и горячая кровь,
И пламенный ум, и к народу любовь.
Мы чувствуем в действиях Климабатыра
Дыхание Сталина — гения мира.

Паэма аб сталінскім наркоме таварышу Ежове добра вядома шматмільённаму чытачу Совецкага Саюза. У гэтай паэме выказана вялікая любоў да сталінскага наркома, які выкарчоўвае асіныя гнёзды подлых здраднікаў нашай вялікай радзімы:

Многоголосое звонкое слово
Летит от народов к батыру Ежову.
Спасибо, Ежов, что, тревогу будя,
Стоиш ты на страже страны и вождя.
Раскрыта змеиная вражья порода
Очами Ежова, руками народа.
Всех змей ядовитых Ежов подстерег
И выкурил гадов из нор и берлог.

Страшэнная нянавісцю гарыць палкае сэрца паэта да праклятых выродкаў — трацкісцка-бухарынскіх бандытаў і іншай нацыяналістычнай контррэволюцыйнай брыды. Аб іх ён гаворыць гнеўна і сакрушальна:

Поганые гады фашистской окраски,
Ползли вы на брюхе по вражьей
указке—
Шпионить, вредить, убивать и
взрывать,
Страну продавать и народ предавать.

Па адрасу ворагаў мудры Джамбул пасылае знішчальныя праклёны ўсяго працоўнага народа. Вялікай нянавісцю загараецца сэрца, калі чытаеш вершы, прысвечаныя працэсу над трацкісцка-бухарынскай нечысцю. Нянавісць Джамбула — нянавісць усяго 170-мільённага народа. Яна паражае, як меч, як куля, якая трапляе ў самае сэрца ворага:

А враг настороже, озлоблен и лют,
Прислушайся: ночью злодеи ползут.
Ползут по оврагам, несут изуверы
Наганы и бомбы, бациллы холеры,
Чумы и проказы, что смерти
страшней,
И яды фаланг, скорпионов и змей.
Ползут на любое злодейство готовы...
Но зорки орлиные очи Ежова.

Паэзія Джамбула ў пераважнасці сваёй — палітычная паэзія, якая не пазбаўлена песеннага лірызму. Любы верш Джамбула моцна прачуты, авеяны адменнай джамбулаўскай лірычнасцю. Верш «Калыханка» — яркае сцверджанне таму, што лірыка Джамбула — лірыка высокага эмацыянальнага тонусу. Вобраз клапатлівага, ласкавага правадыра, які паказаны ў творы, робіць верш выключна цёплым і сонечным. Майстэрскае спалучэнне глыбокага лірызму з выключна багатай сэнсавай нагрузкай страфы робіць верш Джамбула непадражальным:

Засыпай, малыш-казах,
Ты в испытанных руках,
Сталин смотрит из окошка —
Вся страна ему видна.
И тебя он видит, крошка,
И тебя он любит, крошка,
За тебя, мой теплый крошка,
Отвечает вся страна.

Джамбул—выключна радасная з'ява ў нашым паэтычным жыцці. 92-гадовы песняр спявае песні магутнай сілы, адгукаючыся на самыя рознастайныя падзеі нашага жыцця. Будучы літаральна непісьменным, ён мае выключна багатую памяць і багаты жыццёвы вопыт. Увесь вялікі Совецкі Саюз, усю багатую гісторыю совецкага народа добра ведае паэт. Ён спявае пра украінскага паэта Тараса Грыгор'евіча Шаўчэнку, пра Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна, пра геніяльнага грузінскага паэта Шота Руставелі. У 92 гады ён робіць вялікае падарожжа з далёкага Казахстана на руставелеўскі пленум ССП СССР у Тбілісі. Джамбул наведаў радзіму вялікага Сталіна, і пленум Саюза пісьменнікаў з захапленнем слухаў яго ўзнятыя песні.

Вось ён узыходзіць на трыбуну. На ім стракаты казахскі халат. Твар і рукі колеру апаленай сонцам казахскай пустыні. Глыбокія вочы поўны агню. Прывычнай рукой векавы волат кранае струны сваёй паслушнай дамбры. І песня гучыць, як гул стэповай пургі. Добра ведаючы невычэрпнае багацце казахскага фальклору, яму не трэба доўга думаць над страфой. Песня сама пяецца. Яе не стрымаць, таму што яна — біенне сэрца, душа вялікага песняра.

Так нарадзіліся і нараджаюцца песні, якія спяваюцца ўсімі народамі нашага Совецкага Саюза, славячымі геній вялікага Сталіна і яго слаўных саратнікаў. Гэта самыя любімыя, самыя папулярныя песні нашага радаснага совецкага народа.

Адказны рэдактар І. ГУРСКІ.

Друкарня «Звязды» Газета «Літаратура і мастацтва» выходзіць адзін раз у пяцідзёнку. Адрас рэдакцыі газеты: Менск, Совецкая, 76, Дом Тэлефон 25-384. Уп. Галоўлітбела Г—4665.